Голас Радзімы

2 лістапада 1978 г.
№ 44 (1562)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Год выдання 23-і
Цана 2 кап.



«Камсамол — гэта юнацтва Радзімы». Так пяецца ў адной папулярнай савецкай песні. Тамара ЛАБКО, якую вы бачыце на здымку С. КРЫЦКАГА, якраз з тых, пра каго пішуць кнігі і складаюць песні. За працоўныя дасягненні зборшчыца вытворчага аб'яднання «Інтэграл» удастоена прэміі Ленінскага камсамола Беларусі; як актыўную грамадскую дзяячку яе выбіралі дэлегатам камсамольскіх з'ездаў у Мінску і Маскве.

29 КАСТРЫЧНІКА 1918 ГОДА І УСЕРАСІЙСКІ З'ЕЗД САЮЗАЎ РАБОЧАЙ І СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ АБВЯСЦІЎ НАРАДЖЭННЕ КАМСАМОЛА — САМАЙ МАСАВАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ Ў КРАІНЕ. ЗА ШЭСЦЬ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ, ШТО МІНУЛІ З ТАГО ЧАСУ, КАМСАМОЛ ВЫХАВАЎ НЕ АДНО ПАКАЛЕННЕ ВЕРНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА СПРАВУ КАМУНІЗМУ.

Матэрыялы, прысвечаныя юбілею ВЛКСМ, чытайце ў сённяшнім нумары.

[«Святкуе маладосць», «Камсамол сёння: лічбы і факты», «Залацінка — не проста станцыя»—стар. 2—3, «Верность революционной биографии»—стар. 4—5, «Прэмія вянчае дастойных»—стар. 7.]

СВЯТКУЕ МАЛАДОСЦЬ

У гарадах і вёсках Беларусі адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя 60-годдзю Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі (ВЛКСМ).

Напярэдадні свята Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі звярнуўся да беларускіх камсамольцаў з прывітаннем. Яркай старонкай у слаўны летапіс ВЛКСМ, сказана, у прыватнасці, у прывітанні, увайшла біяграфія Ленінскага камсамола Беларусі, якая стваралася юнакамі і дзяўчатамі на палях бітваў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, у гады станаўлення Савецкай улады, на працоўных франтах пяцігодак. Камсамол Беларусі — адзін з актыўных, баявых атрадаў ВЛКСМ, згуртоўваючы вакол партыі шырокія масы моладзі, дапамагае партыйным арганізацыям рэспублікі выхоўваць ідэйна стойкіх, фізічна і маральна загартаваных барацьбітоў за шчасце народа, за перамогу ідэалаў камунізму, гарачых патрыётаў і перакананых інтэрнацыяналістаў, бязмежна адданых Радзіме абаронцаў заваёў Вялікага Кастрычніка.

ЦК КПБ выказаў упэўненасць у тым, што камсамольцы, усе юнакі і дзяўчаты рэспублікі і надалей будуць праяўляць высокую палітычную актыўнасць, аддаваць усе свае сілы, веды, увесь запал сваіх маладых сэрцаў барацьбе за вялікую справу партыі, за выкананне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС.

25 кастрычніка ў Мінску адбылося сумеснае ўрачыстае пасяджэнне ЦК ЛКСМБ, мінскіх абкома і гаркома ЛКСМ Беларусі, прысвечанае знамянальнаму юбілею.

У акруговым Доме афіцэраў сабраліся члены і кандыдаты ў члены ЦК ЛКСМБ, члены Рэвізійнай камісіі ЛКСМБ, ветэраны вайны і працы, члены мінскіх абкома і гаркома камсамола, важакі камсамольска-маладзёжных калектываў, маладыя перадавікі і наватары вытворчасці, героі бітвы за ўраджай трэцяга года пяцігодкі, прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў, грамадскасці горада-героя, воіны Савецкай Арміі, дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва, студэнты і школьнікі.

З дакладам «60 гадоў ВЛКСМ» на пасяджэнні выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ К. Платонаў.

Свой юбілей, сказаў у дакладзе К. Платонаў, Ленінскі камсамол адзначае праз год пасля ўсенароднага святкавання 60-годдзя Савецкай улады, напярэдадні 110-й гадавіны з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Усё, чым жыве, аб чым марыць сёння савецкая моладзь, уся радасць сённяшняга свята непарыўна звязаны з партыяй, з Леніным, з Вялікім Кастрычнікам.

Кастрычніцкая рэвалюцыя азнаменавала карэнны пералом у лёсе маладога пакалення нашай краіны, адкрыла яму шлях да творчай працы, ведаў і культуры, дала ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

У сваім дакладзе К. Платонаў расказаў аб гісторыі станаўлення беларускага камсамола, аб слаўных старонках яго біяграфіі і аб тым, як моладзь рэспублікі ўдзельнічае ў рашэнні грандыёзных задач сённяшняга дня.

На пасяджэнні выступілі таксама ветэраны камсамола, маладыя прадстаўнікі рабочага класа, сялянства і інтэлігенцыі рэспублікі. Удзельнікі ўрачыстасці прынялі прывітальнае пісьмо ЦК КПСС, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС Л. Брэжневу.

Мітынгі і сходы з выпадку свята моладзі прайшлі ў многіх працоўных калектывах рэспублікі.

КАМСАМОЛ СЁННЯ: ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі (ВЛКСМ) 29 кастрычніка 1978 года адзначае сваё 60-годдзе. Гэта арганізацыя камуністычная па мэтах, самадзейная па метадах работы, арганізацыйна самастойная. Камсамол сёння — самая масавая грамадская маладзёжная арганізацыя СССР, якая аб'ядноўвае 38 мільёнаў юнакоў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 28 год.

ВЛКСМ працуе пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі. Камсамольцы складаюць сёння асноўны кантынгент папаўнення КПСС — трое з чатырох уступаюць у партыю па рэкамендацыі камсамола.

***

Толькі ў апошні час было прынята сем пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, якія непасрэдна датычаць пытанняў працы, адукацыі, быту і адпачынку моладзі. У 1968 годзе ўтвораны камісіі па справах моладзі абедзвюх палат Вярхоўнага Савета СССР. У мясцовых Саветах дзейнічае 12 288 такіх камісій, у складзе якіх працуюць 82 640 дэпутатаў.

***

Камсамол прымае актыўны ўдзел у кіраванні дзяржавай. Згодна з Канстытуцыяй СССР, ён мае права заканадаўчай ініцыятывы. Сярод дэпутатаў мясцовых Саветаў больш як 20 працэнтаў — камсамольцы. Прыкладна кожны дзесяты дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўных Саветаў саюзных і аўтаномных рэспублік — член ВЛКСМ. Больш як мільён камсамольцаў удзельнічаюць у рабоце органаў народнага кантролю, амаль столькі ж выбраны ў прафсаюзныя камітэты. Моладзь складае прыкладна трэць усіх удзельнічаючых у органах грамадскага кіравання прадпрыемствамі.

***

ВЛКСМ аб'ядноўвае прадстаўнікоў больш як 100 нацый і народнасцей, што пражываюць у СССР. 52,4 працэнта камсамольцаў — жанчыны. У ВЛКСМ прадстаўлены ўсе катэгорыі савецкай моладзі: рабочыя (34,9 працэнта), калгаснікі (6,4 працэнта), служачыя (16,3 працэнта), навучэнцы (42,0 працэнта). У народнай гаспадарцы занята 57,6 працэнта членаў ВЛКСМ, з іх 46,8 працэнта — непасрэдна ў сферы матэрыяльнай вытворчасці.

***

Сёння 62,1 працэнта камсамольцаў маюць вышэйшую, незакончаную вышэйшую і сярэднюю адукацыю, 42 працэнты членаў ВЛКСМ вучацца ў розных навучальных установах.

17,5 мільёна студэнтаў, маладых рабочых і калгаснікаў, навучэнцаў школ і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў удзельнічаюць у руху навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, больш як 10 мільёнаў навучэнцаў — ва ўсесаюзных алімпіядах па фізіцы, хіміі, матэматыцы. У тыднях навукі, тэхнікі і вытворчасці, праводзімых ЦК ВЛКСМ сумесна з Міністэрствам асветы СССР, удзельнічае каля 16 мільёнаў школьнікаў.

У СССР звыш 250 тысяч маладзёжных творчых аб'яднанняў, 300 студэнцкіх канструктарскіх бюро, якія аб'ядноўваюць больш за 2,5 мільёна юнакоў і дзяўчат. З 1967 года штогод прысуджаюцца прэміі Ленінскага камсамола ў галіне навукі і тэхнікі.

***

Камсамольцы і моладзь маюць усе магчымасці для авалодання духоўнымі і культурнымі каштоўнасцямі. Дзейнічаюць больш як 135 тысяч клубаў і Дамоў культуры, 1 323 музеі, 350 тысяч бібліятэк з кніжным фондам 4,2 мільярда экземпляраў, 537 тэатраў, 157 тысяч кінаўстановак.

Сумесна з творчымі саюзамі (пісьменнікаў, мастакоў і інш.) камсамол праводзіць нарады маладых пісьменнікаў, фестывалі палітычнай песні, выстаўкі твораў маладых мастакоў, тыдні дзіцячага кіно і г. д.

З 25 мільёнаў савецкіх людзей, якія займаюцца мастацкай самадзейнасцю, 70 працэнтаў камсамольцы і моладзь.

***

Камсамол надае вялікую ўвагу развіццю спорту. Больш за 76 мільёнаў чалавек рэгулярна займаюцца фізкультурай і спортам, большасць з іх моладзь. У распараджэнні спартсменаў 3 200 стадыёнаў, 1 300 плавальных басейнаў, 63 400 спартыўных залаў, 80 крытых лёгкаатлетычных манежаў.

17 мільёнаў юных спартсменаў аб'ядноўваюць клубы «Скураны мяч» (футбол), «Залатая шайба» (хакей), «Белая тура» (шахматы) і інш.

Усяму свету вядомы імёны камсамольцаў-чэмпіёнаў: Валерыя Барзова, Людмілы Турышчавай, Анатоля Карпава, Уладзіслава Траццяка.

***

Камсамол прымае актыўны ўдзел у эканамічным развіцці краіны. Толькі ў 1978 годзе 140 буйнейшых будоўляў вядуцца пад эгідай ВЛКСМ. Камсамол таксама аб'явіў шэфства над развіццём так званых тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў: Заходнесібірскага, Брацка-Усць-Ілімскага, Паўднёва-Якуцкага, Паўладар - Экібастузскага, Курскай магнітнай анамаліі, Байкала-Амурскай магістралі, прыроўненай да іх па маштабу. У шарэнгах будаўнікоў 4 мільёны юнакоў і дзяўчат, з іх 1,4 мільёна — члены ВЛКСМ.

***

ВЛКСМ — адзін з буйнейшых выдаўцоў у СССР. 234 камсамольскія і піянерскія газеты і часопісы маюць разавы тыраж 76 мільёнаў экземпляраў. Сёння кожная шостая кніга, якая выдаецца ў СССР, адрасавана маладому чытачу. Тры камсамольскія выдавецтвы выпусцілі толькі за 1977 год 650 назваў кніг і брашур тыражом 52,22 мільёна экземпляраў.

***

ВЛКСМ і Камітэт маладзёжных арганізацый СССР супрацоўнічаюць сёння з 1 350 нацыянальнымі, рэгіянальнымі і міжнароднымі маладзёжнымі і студэнцкімі арганізацыямі з 130 краін свету.

Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму СССР «Спадарожнік» падтрымлівае дзелавыя і карэспандэнцкія кантакты з 500 арганізацыямі з 80 краін усіх кантынентаў.

АДН.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ



Хуткімі тэмпамі вядзецца ўборка цукровых буракоў у калгасе імя Дзяржынскага Слуцкага раёна. З кожнага гектара калгаснікі атрымліваюць іх тут больш як 250 цэнтнераў.

НА ЗДЫМКУ: уборка цукровых буракоў у калгасе.

КРОКІ ІНДУСТРЫІ

Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне БССР паведаміла, што працаўнікі прамысловасці рэспублікі паспяхова выканалі план дзевяці месяцаў.

Перавыкананы план па аб'ёму рэалізацыі і вытворчасці большасці важнейшых відаў вырабаў. Прырост прамысловай вытворчасці ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 7,7 працэнта пры гадавым плане 6,1 працэнта. Прадукцыйнасць працы павысілася на 5 працэнтаў, што адпавядае гадавому плану. За кошт гэтага атрымана 66 працэнтаў прыросту прадукцыі.

Асабліва высокія тэмпы росту вытворчасці ў такіх галінах, як машынабудаванне і металаапрацоўка, вытворчасць тавараў культурна-бытавога прызначэння і гаспадарчага ўжытку, хімічная і нафтахімічная прамысловасць.

Палепшыліся тэхніка-эканамічныя паказчыкі работы вытворчых аб'яднанняў і прадпрыемстваў, а таксама якасць выпускаемай імі прадукцыі.

УРАДЖАЙНАЯ «ВЯРБА»

Беларускі навукова-даследчы інстытут бульбаводства і плодаагароднiцтва перадаў на дзяржаўныя выпрабаванні некалькі новых перспектыўных гатункаў бульбы.

Адзін з іх, выведзены акадэмікам П. Альсмікам, атрымаў назву «вярба». Гэты сярэдне-позні гатунак дае 400—500 цэнтнераў бульбы з гектара, утрымлівае 25—29 працэнтаў крухмалу. «Вярба» ўстойлівая да розных захворванняў, добра захоўваецца.

З ГЛЫБІНІ ВЯКОЎ

Чарговы сезон раскопак на месцы тысячагадовага Віцебска завяршыла археалагічная экспедыцыя Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. Асабліва багатымі аказаліся знаходкі ў скверы па вуліцы Пушкіна, паблізу ўпадзення ракі Віцьбы ў Заходнюю Дзвіну. Тут выяўлены сотні прадметаў, якія служылі жыхарам горада шмат вякоў таму назад.

У ліку арыгінальных знаходак сезона — грабеньчык X стагоддзя, шахматная тура і абутак, якія адносяцца да XII стагоддзя. Даследаваны магутны абарончы вал з гліны і пяску вышынёй каля 8 метраў.

ЗАВОДСКІ «КОДЭКС ЯКАСЦІ»

З гэтага часу дыхтоўнасць грузавікоў маркі Мінскага аўтазавода гарантуецца комплекснай сістэмай кіравання якасцю прадукцыі. Нават папярэдні падлік абяцае эканомію ад яе ўкаранення не менш як паўтара мільёна рублёў. Шматгадовы по-

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

ЗАЛАЦІНКА — НЕ ПРОСТА СТАНЦЫЯ

Байкала-Амурская магістраль (БАМ) — гэта 4 341 кіламетр чыгуначнага палатна ад Тайшэта (невялікай станцыі на транссібірскай дарозе) да Савецкай Гавані на Ціхаакіянскім узбярэжжы. Яна вырашыць транспартныя праблемы на тэрыторыі, роўнай тром Францыям. «Магістраль будучага», «будоўля веку» — не скупіцца на эпітэты прэса. Па памерах капітальных затрат і эканамічнай эфектыўнасці праект БАМа мае маштабы нацыянальнай праграмы. Актыўны ўдзел у будаўніцтве прымаюць усе рэспублікі СССР. Над вялікім участкам БАМа шэфствуе камсамол Беларусі.

Сёння мы друкуем нататкі журналіста Уладзіміра ПАЎЛОВІЧА, які неаднойчы бываў на будаўніцтве магістралі.

ПАСЛЯ сямі дзён дарогі дэсант беларускіх камсамольцаў 3-га красавіка 1975 года высадзіўся ў Паўднёвай Якуціі, побач з самай халоднай 60-й паралеллю. Маленькая пляцоўка на заснежанай таёжнай сопцы паступова расшыралася, станавілася адным з важнейшых участкаў усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўлі.

Неўзабаве ў ЦК камсамола Беларусі прыйшла з Якуціі лаканічная тэлеграма: «Пасёлак закладзен. Назвалі Залацінкай». Потым сталі паступаць і іншыя падобныя данясенні.

Уся Беларусь сачыла за дзеяннямі сваіх пасланцоў, ганарылася імі, дапамагала. За першым атрадам імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі рушыў другі, трэці, чацвёрты, пяты... Камсамольцы Мінскага аўтамабільнага завода выступілі ініцыятарамі шэфства над атрадам імя Мікалая Кедышкі. Яны ў нерабочы час зрабілі і адправілі будаўнікам Залацінкі некалькі кантэйнераў электрамантажнага і слясарнага інструменту, стропаў і іншага неабходнага інвентару. Услед за гэтым у адрас атрада пайшоў з рэспублікі і духоўны пажытак — кнігі, часопісы, газеты, мастацкія выстаўкі. Моладзі, людзям старэйшага пакалення — усім хацелася мець дачыненне да спраў беларускіх бамаўцаў, і тысячы нябачных, але трывалых ніцей працягнуліся з рэспублікі да іх...

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●

шук, звязаны з распрацоўкай і ўводам сістэмы ў дзеянне, даў яшчэ адзін адчувальны вынік: усе аўтамабілі, якія выпускаюцца серыйна, атэставаны дзяржаўным Знакам якасці.

Сістэма ўключыла ў сябе 89 стандартаў прадпрыемства. Яны рэгламентуюць змест і парадак работ, якія выконваюцца ўсімі падраздзяленнямі па кіраванню якасцю, асваенню новых відаў прадукцыі і паляпшэнню эканамічных паказчыкаў дзейнасці завода.

ЛЕС ПАД ДАХАМ

У Брэсцкай вобласці, недалёка ад будынка Іванаўскага лясніцтва, з'явілася незвычайная цяпліца. Тут пад празрыстым дахам зеляняюць парасткі саджанцаў сасны. Такі прагрэсіўны спосаб вырошчвання пасадачнага матэрыялу дае вялікую эканомію.

Саджанцы ў цяплічных умовах развіваюцца ў два разы хутчэй звычайнага.

НОВЫ САЎГАС

Тры гады назад у Ганцавіцкім раёне быў закладзены першы падмурак цэнтральнай сядзібы новага саўгаса «Адраджэнне», на будаўніцтва якога выдаткавана звыш дзесяці мільёнаў рублёў.

Зараз тут пабудавана пяць шматпавярховых жылых дамоў. Будаўнікі ўзводзяць першую чаргу жывёлагадоўчага комплексу на 3 200 кароў, тыпавую майстэрню, медпункт і лазню. У бліжэйшыя гады пасёлак упрыгожаць сучасныя карпусы Палаца культуры, адміністрацыйнага будынка, сярэдняй школы, гандлёвага комплексу.

Новы саўгас будзе спецыялізавацца на вытворчасці малака і мяса.

У 24 краіны свету адпраўляе сваю прадукцыю Барысаўская фабрыка піяніна. Не меншым попытам, чым асноўная прадукцыя прадпрыемства — піяніна, карыстаюцца і электрагітары, і дзіцячыя музычныя цацкі.

НА ЗДЫМКУ: на канвееры зборкі ідзе мантаж клавішных механізмаў піяніна.

НА ВЫСТАЎКАХ— ФАРФОР І КЕРАМІКА

Чайныя і кафейныя сервізы ў розным афармленні, вазы, сувенірныя вырабы з алімпійскай сімволікай — усё гэта дэманстравалася ў мінскім магазіне «Крышталь». Тут з поспехам прайшла выстаўка-продаж прадукцыі Мінскага фарфоравага завода. А ў магазіне «Паўлінка» адкрылася выстаўка керамічных вырабаў беларускіх майстроў. Наведвальнікі маюць магчымасць набыць пасуду, вазы, статуэткі і іншыя цікавыя вырабы.

З УСІМІ ВЫГОДАМІ

Кватэры з усімі выгодамі атрымалі 250 сем'яў земляробаў і жывёлаводаў калгаса «Чырвоная змена» Любанскага раёна. Мінскія архітэктары пры складанні праектаў улічылі пажаданні калгаснікаў. У новых дамах — лоджыі, пераходы, што злучаюць кухню з гасцінай, ва ўсіх пакоях — паркетная падлога, а ў шматпавярховых будынках — смеццеправоды і ліфты.

У цэнтры гарадка, што ўзняўся сярод асушаных балот на маляўнічым беразе Арэсы, стаіць Палац культуры. Тут размясцілася карцінная галерэя, ёсць плавальны басейн. Побач — гандлёвы комплекс, Дом быту, сярэдняя і музычная школы, дзіцячы камбінат.

● ПАДЗЕІ ● ПЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●

З УСІХ КУТКОЎ РЭСПУБЛІКІ

З АБНОЎЛЕНЫХ ЗЯМЕЛЬ

Сапраўдным залатым дном сталі абноўленыя землі ў калгасе «Светлы шлях» Маладзечанскага раёна. Гаспадарка сабрала з кожнага гектара каля 50 цэнтнераў збожжа, высокі ўраджай бульбы, цукровых буракоў, кармавых культур. На гэтай аснове інтэнсіўна развіваецца жывёлагадоўля. Гадавая вытворчасць малака ў разліку на кожныя сто гектараў сельгасугоддзяў перавысіла тысячу і мяса — 250 цэнтнераў.

Палі сталі ўрадлівымі дзякуючы садружнасці меліяратараў і сялян. На вялікіх масівах — больш як дзве тысячы гектараў — пракладзен дрэнаж, абсталяваны асушальна-ўвільгатняльныя сістэмы, уведзена арашэнне культурнай пашы. Комплекс меліярацыйных мерапрыемстваў умела спалучаецца з прагрэсіўнай агратэхнікай. Калгаснікі паглыбілі ворыўны гарызонт, багата ўгнойваюць ніву, вапнуюць кіслыя глебы, вырошчваюць лепшыя гатункі. Адсюль і высокія ўраджаі.

Меліяратары Беларусі пераратварылі ў першакласныя сельгасугоддзі звыш 2,5 мільёна гектараў малапрадукцыйных зямель і бясплодных багнаў. Гаспадаркі атрымліваюць на іх каля трэці ўсёй прадукцыі раслінаводства і палавіну кармоў для жывёлы.

Цяпер усе сілы накіраваны на выкананне пастаўленай ліпеньскім (1978 г.) Пленумам ЦК КПСС цэнтральнай задачы карэннага паляпшэння выкарыстання меліяраваных зямель, павышэння іх урадлівасці, ліквідацыі адставання ў гаспадарчым асваенні. Асновай асушэння ўсюды стаў закрыты дрэнаж. Будуюцца меліярацыйныя сістэмы двухбаковага дзеяння, у тым ліку і з аўтаматычным рэгуляваннем водна-паветранага рэжыму глебы. Для палівання агародаў і кармавых угоддзяў зманціравана дажджавальная тэхніка. Меліяратары вядуць работы ў адзіным комплексе.

Я. ГАЛКІН.

На цэнтральнай сядзібе дзяржплемзавода «Індустрыя» ў вёсцы Блонь Пухавіцкага раёна здадзены ў эксплуатацыю Дом быту. Тут ёсць рамонтная і швейная майстэрні, цырульня, пракатны пункт, фінская лазня. Работнікі комплексу прапануюць насельніцтву 19 відаў паслуг.

НА ЗДЫМКАХ: новы комплекс быту.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ІНСТЫТУТ ПРАЕКТУЕ АСК

Сучаснымі камп'ютарамі, здольнымі выконваць 120 тысяч аперацый у секунду, аснасцілі праектна-тэхналагічны інстытут, які адкрыўся ў Мінску. Ён заняўся распрацоўкай аўтаматызаваных сістэм кіравання (АСК) для сельскай гаспадаркі Беларусі.

Кібернетыка ўжо стала надзейнай саюзніцай сялян. У прыватнасці, па іх заказах з дапамогай хуткадзеючых ЭВМ складзены аграхімічныя пашпарты палёў і тэхналагічныя карты вырошчвання збожжавых і іншых культур, вызначаецца патрэба гаспадарак ва ўгнаеннях і даследуецца іх эфектыўнасць, складаюцца рацыёны кармлення жывёлы, аналізуецца бухгалтарская справаздачнасць, сістэматызуецца кантроль за якасцю прадукцыі.

Новы інстытут распрацуе комплексныя праграмы кіравання жывёлагадоўляй, вытворчасцю кармоў і ўрадлівасцю глебы. Іх укараненне, паводле падлікаў эканамістаў, на дзесяць працэнтаў павялічыць зборы прадукцыі і адначасова палепшыць яе якасць.

Г. ЯФІМАЎ.

КАЛГАСНЫЯ ПАРКІ

Парк культуры і адпачынку закладзен у калгасе імя Кірава Слуцкага раёна. У ім пасаджана каля трох тысяч дрэў і кустоў розных парод, разбіты клумбы, пастаўлены альтанкі. Побач — возера з лодачнай станцыяй, спартыўны комплекс, дом адпачынку для сялян.

Комплексная праграма карэннай перабудовы вёсак спалучаецца ў Беларусі з вялікімі работамі па азеляненню. Акрамя паркаў і сквераў у сельскіх пасёлках у гэтай пяцігодцы амаль на 18 тысячах гектараў закладваюцца лесанасаджэнні на берагах рэк і вадаёмаў, у лагчынах і кручах, на пясках і іншых землях.

Е. НАУМАЎ.

Я СТАЮ на шумнай, мнагалюднай плошчы Залацінкі. Навокал размешчаны адміністрацыйныя будынкі, гасцініца, сталовая, паштовае аддзяленне, прамянямі разыходзяцца ў тайгу акуратна забудаваныя вуліцы — праспект імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі, Беларуская, Бамаўская, імя касманаўта Пятра Клімука. Памяць вяртае ў мінулае, вядзе туды, адкуль пачыналася Залацінка. Вунь там, пад статнымі лістоўніцамі, стаяў першы вагончык. Было гэта 18 сакавіка 1975 года. Вечарэла, калі некалькі чалавек— сакратар партыйнай арганізацыі будаўніча-мантажнага поезда № 578 Віктар Капелька, брыгадзір цесляроў Васіль Кудар і іншыя — выйшлі з машыны і, правальваючыся па пояс у снег, накіраваліся ў тайгу. Потым яны гадзіны дзве чакалі вагончыка, ратуючыся за дрэвамі ад пякучага, пранізлівага паўночнага ветру. Нарэшце, вагончык прыбыў. Але як зняць яго з прычэпа? Вырашылі звярнуцца за дапамогай да золатаздабытчыкаў. Тыя прыслалі бульдозер. Неўзабаве ля прычэпа вырасла вялікая гурба, па якой і спусцілі вагончык. Ноччу спалі ў ім на падлозе, а раніцай дарэмна спрабавалі наталіць смагу — вада начыста вымерзла, ператварыўшыся ў крышталікі іскрыстага лёду.

Хутка на схіле сопкі з'явілася цэлая чародка сініх вагончыкаў, дзе пасяліліся беларускія камсамольцы. Адсюль кожную раніцу выходзілі яны на нялёгкую работу ў тайгу. Асабліва цяжка даводзілася ім спачатку. Не хапала вопыту, майстэрства, тэхнікі было мала, ды і не ўсюды яна магла падступіцца.

Зняўшы прамоклыя ад поту курткі, хлопцы ўпарта штурмавалі вечную мерзлату, убівалі ў непадатлівую сопку смаляністыя палі фундаментаў, уручную падносілі цяжкія шчыты. Кожны новы аб'ект — жылы дом, сталовая або склад—патрабаваў вялікіх намаганняў. І расла Залацінка, усё больш прыкметным на фоне тайгі станавілася яе самабытнае аблічча.

У шырокія вуліцы ператварыліся пратаптаныя першапраходцамі сцяжынкі — і вагончыкі пацясніліся, саступіўшы месца шматкватэрным дамам, інтэрнатам, магазінам...

Іх было крыху больш за сто чалавек — удзельнікаў першага дэсанта. І наўрад ці думалі яны, закладваючы Залацінку, што ўсяго праз два гады яна будзе прызнана лепшым пасёлкам Цэнтральнага ўчастка БАМа і што слава аб ёй пойдзе па ўсім свеце.

«Вярнуўшыся з будаўніцтва тунеля ў Нагорным, я пры дзённым святле ўбачыў Залацінку,—піша ў часопісе «Гранма» кубінскі журналіст Хаакін Рыверы. — У наш першы прыезд яна была схавана надышоўшым змрокам, а цяпер ляжала, як на далоні, на схіле ўзгорка. Вельмі сімпатычны пасёлак, выдатна спраектаваны».

К ОЖНАМУ з маладых беларускіх сібіракоў ёсць што расказаць аб сабе і сваіх справах на «будоўлі веку». Васіль Жураўскі нарадзіўся і вырас на Гомельшчыне. Маці — даярка на ферме ў калгасе «Савецкая Беларусь» Нараўлянскага раёна. Бацька— былы франтавік, цяпер таксама працуе на ферме. Малодшыя брат і сястра — будаўнікі, сярэдні — механізатар. Сам Васіль працаваў на ўдарнай камсамольскай будоўлі — Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе. Залацінку ж ведае з першага забітага ў тайзе калка, з першага да апошняга дома яе галоўных вуліц. Кіраўніцтва брыгадай перадаў Івану Аляхновічу. Камсамольцы поезда абралі Васіля камісарам атрада — так называюць на БАМе пасаду камсамольскага сакратара. Ён — член Нерунгрынскага гаркома ВЛКСМ, дэпутат гарадскога савета.

З чэрвеня 1974 года працуе на БАМе Любоў Карых. Спачатку разам з мужам будавала горад Тынду, а затым у складзе атрада першапраходцаў прыехала ў Залацінку, выбрана тут сакратаром камсамольскага бюро ўпраўлення поезда, узнагароджана Ганаровымі граматамі Якуцкага абкома камсамола і Галоўнага будаўнічага ўпраўлення. Ганаровай граматай ЦК ЛКСМ Беларусі ўзнагароджан ударнік камуністычнай працы Анатоль Дучынскі.

Падрастае і юнае пакаленне бамаўцаў. Ужо ходзіць у дзіцячы сад першы ўраджэнец Залацінкі, сын Паўла і Тамары Глухатарэнкаў — Паўлік. Разам з ім наведваюць сад больш як дзвесце малышоў.

Помніцца, калі вясной 1975 года тут атрымалі праект сярэдняй школы, разлічанай на 320 месц, сёй-той з будаўнікоў засумняваўся. Маўляў, ці не занадта вялікая яна і ці не будуць пуставаць класы. А сёння школу наведвае ўжо звыш сямісот дзяцей і працуе яна ў дзве змены.

Н ЕПАДАЛЁКУ ад новай Залацінкі ёсць яшчэ адна, старая. Знаходзіцца яна ўсяго за чатыры кіламетры ад сваёй маладой «сястры» на беразе шырокай Іенгры. Менавіта сюды прыбыў першы беларускі атрад. Марозным вечарам таго дня іх, прамерзлых, стомленых пасля доўгай дарогі, хлебам-соллю сустрэлі гасцінныя гаспадары пасёлка— эвенкі і якуты. Усё падрыхтавалі яны для гасцей з далёкага краю — цёплыя словы прывітання, гарачую лазню, добрую вячэру. Тая памятная сустрэча стала пачаткам вялікай дружбы паміж беларусамі і старажыламі якуцкай зямлі.

Нядаўна я зноў пабываў у старой Залацінцы. Шмат чаго змянілася тут. На сагрэтым сонцам пагорку з'явіліся новыя дамы, а многія са старых адрамантаваны і акуратна пафарбаваны ў зялёны, накшталт тайгі, колер. Ды і народу тут прыкметна прыбавілася. Што ж, перамены зусім заканамерныя.

На вуліцы каля пасялковага Савета мы сустрэлі дырэктара саўгаса «Залацінка» Генадзя Аляксеева. Помню, два гады назад мясцовыя паляўнічыя скардзіліся на цяжкасці, узнікшыя перад імі з пачаткам будаўніцтва БАМа. Маўляў, звер не любіць шуму, бяжыць далёка ў глыб тайгі і ўгнацца за ім нялёгка. Я пацікавіўся ў Генадзя Антонавіча, як цяпер ідуць справы ў паляўнічых.

— Добра, — сказаў ён. — Звер прывыкае да шуму і часам ужо не звяртае на яго ўвагі. Вунь учора наш заатэхнік выйшаў на паляванне і за рэчкай, побач з пасёлкам, узяў двух сабалёў.

У маім журналісцкім блакноце разам з іншымі «бамаўскімі» запісамі ёсць верш, складзены Надзеяй Лушчык. Яна піша пра нялёгкую працу будаўнікоў, пра першыя радасці стварэння і канчае верш словамі:

Залацінка — не проста
станцыя,
Гэта станцыя—юнацтва маё!

Скончыўся спектакль, і за кулісы да акцёраў прыйшлі ўдзячныя гледачы. Цяжка сказаць, каго больш усхвалявала гэта сустрэча. Артыстаў, якія толькі што ўвасаблялі на сцэне вобразы юных змагароў за рэвалюцыю і раптам убачылі перад сабой аднаго з іх, ці сівога ветэрана, удзельніка грамадзянскай вайны, які адчуў у сучасных юнаках і дзяўчатах вернасць ідэям Кастрычніка.

НА ЗДЫМКУ: ветэран партыі Мікалай ВАВЕРАЎ сярод акцёраў Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача — удзельнікаў спектакля «Юнацтва бацькоў».

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

«ГАНАРУСЯ РАБОТАЙ У БЕЛАРУСІ...»

Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра ПІЧЭТЫ

Споўнілася 100 год з дня нараджэння Уладзіміра Пічэты, таленавітага гісторыка, буйнейшага арганізатара навукі, умелага педагога і выхавацеля.

Ён нарадзіўся 9(21) кастрычніка 1878 года ў Палтаве. Скончыўшы класічную гімназію, паступае на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Праца даследчыка-гісторыка захапляе яго, і ён аддаецца ёй поўнасцю. У 1918 годзе У. Пічэта як галоўны інспектар Цэнтрархіва ўдзельнічае ў рэформе архіўнай справы, разам з іншымі вучонымі і архівістамі прымае меры да выратавання каштоўнейшых дакументальных фондаў. Ён прыцягваўся да савецка-польскіх перагавораў (1920—1921 гг.) у якасці эксперта па пытаннях архіваў і помнікаў культуры. У лютым 1918 года Уладзімір Іванавіч абараніў кандыдацкую, а ў сакавіку таго ж года — доктарскую дысертацыю.

Значную частку свайго жыцця У. Пічэта аддаў рабоце ў нашай рэспубліцы. Ён — першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На гэтай пасадзе з асобай сілай праявіліся выключныя арганізатарскія, навуковыя і педагагічныя здольнасці вучонага. Пад яго кіраўніцтвам ва універсітэце нястомна ўдасканальваўся навукова-педагагічны працэс, пастаянна ўмацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база, паляпшалася падрыхтоўка маладых навуковых кадраў.

У 1927 годзе па ініцыятыве рэктара пры БДУ адкрываецца аспірантура па грамадскіх дысцыплінах, якая стала важнай формай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. У. Пічэту належыць вялікая заслуга ў выхаванні цэлай групы даследчыкаў гісторыі Беларусі, у якую ўвайшлі выпускнікі універсітэта А. Бурдэйка, К. Кернажыцкі, Д. Дудкоў і інш.

Успамінаючы тыя гады, яго дачка Ксенія піша, што аспіранты мелі звычку па нядзелях збірацца на кватэры Уладзіміра Іванавіча. Сустрэчы нярэдка ператвараліся ў гарачыя дыскусіі, у якіх ахвотна ўдзельнічаў і сам гаспадар. Ён любіў і ўмеў дыскуціраваць, што тлумачылася яго вялікімі ведамі і фенаменальнай памяццю. Гэтыя мінскія нядзельнікі, адзначае аўтар успамінаў, былі правобразам маскоўскіх «пічэтнікаў».

Уладзімір Іванавіч з клопатам ставіўся да студэнтаў, да ўмоў іх жыцця, да набыцця імі навыкаў навукова-даследчай працы, цаніў іх краязнаўчую работу, якой і ў той час надавалася вялікае значэнне. Пры яго актыўным удзеле ўжо ў першыя гады работы універсітэта былі ажыццёўлены дзве краязнаўчыя экскурсіі — на Мазыршчыну і Полаччыну, даўшыя важныя навуковыя і практычныя вынікі.

Урад Савецкай Беларусі высока цаніў арганізатарскую і навуковую дзейнасць У. Пічэты. 31 кастрычніка 1926 года грамадскасць рэспублікі ўрачыста адзначыла 25-годдзе навукова-педагагічнай і пяцігоддзе рэктарскай работы Уладзіміра Іванавіча. Віншаванне юбіляра праходзіла ў святочна ўпрыгожанай актавай зале універсітэта. У адрасаваным яму прывітанні ўрада Беларускай ССР гаварылася, што У. Пічэта прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў той час, калі значная частка інтэлігенцыі яшчэ вагалася. Асабліва падкрэслівалася тое, што вучоны належаў да той часткі інтэлігенцыі, якая рашуча выступіла ў падтрымку новага дзяржаўнага ладу і дапамагла рабочаму класу ў будаўніцтве новага жыцця.

Беларускі ўрад надаў вучонаму ганаровае званне заслужанага прафесара рэспублікі.

За сваё жыццё Уладзімір Іванавіч падрыхтаваў і апублікаваў каля 500 навуковых прац. Важнае месца сярод іх займаюць работы па гісторыі Беларусі, якіх каля 150. У іх даследуюцца такія пытанні, як сацыяльна - эканамічнае развіццё краю ў эпоху феадалізму, аграрная рэформа ў Беларусі ў пачатку XVII стагоддзя, народныя рухі і класавая барацьба ў XIX і пачатку XX стагоддзя, формы нацыянальнага руху, беларускае кнігадрукаванне, этнагенез беларускага народа, гісторыя гарадоў, развіццё гістарычнай навукі аб Беларусі і г. д.

У час работы ў Мінску вучоным былі выданы такія працы, як «Гісторыя Літоўскай дзяржавы да Люблінскай уніі», «Уводзіны ў рускую гісторыю (крыніцы і гістарыяграфія)», «Пачатак індустрыялізацыі і распад прыгонніцкай гаспадаркі», «Гісторыя сялянскіх хваляванняў у Расіі», «Гісторыя Беларусі» (ч. I), «Сучасная літаратура па гісторыі народнай гаспадаркі» і інш. У іх аўтар шырока адлюстроўвае ролю сапраўднага творцы ўсіх каштоўнасцей — народа.

У. Пічэта паспяхова спалучаў работу рэктара з актыўнай дзяржаўнай і грамадскай дзейнасцю. З 1921 па 1930 год ён выбіраўся членам ЦВК БССР, дэлегатам Усебеларускіх з'ездаў Саветаў, з 1922 па 1930— членам Мінскага гарадскога Савета. Ён унёс важкі ўклад у вырашэнне многіх пытанняў, якія адносяцца да нацыянальнага будаўніцтва, умацавання дзяржаўнага апарату ў рэспубліцы, развіцця беларускай культуры, пашырэння брацкіх сувязей БССР з іншымі савецкімі рэспублікамі.

Гэты выдатны вучоны прыняў актыўны ўдзел у стварэнні Інстытута беларускай культуры і затым—у пераўтварэнні яго ў Акадэмію навук БССР. З 1926 года да апошніх дзён свайго жыцця У. Пічэта быў правадзейным членам Акадэміі навук Беларускай ССР.

Працуючы ў нашай рэспубліцы, Уладзімір Іванавіч зрабіў шэраг паездак за мяжу. У ліпені—верасні 1923 года ён быў у Германіі, дзе працаваў у кнігасховішчах Берлінскай дзяржаўнай бібліятэкі і дзе сабраў матэрыял для напісання такіх работ, як «Новыя тэорыі аб становішчы беларускіх зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага», «Да пытання аб шлюбе Сігізмунда-Аўгуста з Варварай Радзівіл» і інш. Летам 1927 года У. Пічэта працаваў у Варшаве, Берліне і Празе. У Польшчы ён сустрэўся з савецкім паслом Войкавым. Адбылося гэта напярэдадні забойства савецкага дыпламата. Вярнуўшыся на Радзіму, Уладзімір Іванавіч пісаў: «Аб Беларусі ў Чэхіі і Заходняй Еўропе фактычна ніхто нічога не ведае. У французскім славянскім часопісе друкуюцца артыкулы, у якіх беларуская праблема разглядаецца з польскага пункту гледжання... Я дамовіўся, што напішу два артыкулы для часопіса».

Да канца свайго жыцця выдатны вучоны працягваў вывучаць гісторыю Беларусі. З пачуццём радасці ён сустрэў вестку аб уз'яднанні беларускіх зямель у адзінай сацыялістычнай дзяржаве ў 1939 годзе. У часопісе «Историк-марксист» ён выступіў з артыкулам «Асноўныя моманты ў гістарычных лёсах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі». У 1940 годзе на гэтую тэму выйшла яго работа.

Жыццё і дзейнасць у Беларусі пакінулі ў душы У. Пічэты глыбокі след. Аб гэтым сведчыць яго артыкул у газеце «Советская Белоруссия», дзе ён пісаў: «Я вельмі ганаруся тым, што Савецкі ўрад даручыў мне пачэсную, але вельмі цяжкую работу па арганізацыі універсітэта для працоўных мас Беларусі. Я вельмі ганаруся тым, што на працягу сямі з палавінай год я займаў гэтую адказную пасаду і ажыццяўляў усе пастановы Савецкай улады».

Я. БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук.

беседы о молодежи

ВЕРНОСТЬ РЕВОЛЮЦИОННОЙ БИОГРАФИИ

КОРРЕСПОНДЕНТ «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ» ВСТРЕТИЛСЯ С ПЕРВЫМ СЕКРЕТАРЕМ ЦЕНТРАЛЬНОГО КОМИТЕТА КОМСОМОЛА БЕЛОРУССИИ КОНСТАНТИНОМ ПЛАТОНОВЫМ.

— Всесоюзному Ленинскому Коммунистическому Союзу Молодежи—60 лет. Это возраст зрелости, потому что опыт шести десятилетий огромен и поучителен. Это возраст молодости, потому что комсомол, как и на заре своей прекрасной юности, полон энергии и инициативы, так же горяч, порывист, скор на дела.

История ВЛКСМ—это часть героической биографии всего народа. Вместе со страной прошел он путь от почти полной безграмотности до космических высот, от беспросветной нужды до счастливой уверенности в завтрашнем дне, от разрухи и запустения до современной могучей индустрии. Осмысливая эти достижения, мы видим стремительный прогресс нашего народа за шестьдесят лет.

145 миллионов советских людей прошли за эти годы школу комсомола. И каждое поколение вносило в его историю свою неповторимость, свое мужество, свое творчество. Именно потому-то история комсомола — документ живой и страстный.

Двадцатые годы — части особого назначения, рабфаки, культармейцы...

Тридцатые—Комсомольск-на-Амуре, Магнитка, Осинторф...

Сороковые—«Молодая гвардия», Обольское подполье, Александр Матросов и Зоя Космодемьянская...

Пятидесятые—целина...

Шестидесятые—штурм космоса, ударные комсомольские стройки, студенческие строительные отряды...

Семидесятые—БАМ, КамАЗ, Нечерноземье...

Это вехи в биографии, которая не только велика, но и величественна. И все комсомольские поколения связывает и объединяет то, что составляет сущность комсомола — глубокая убежденность в правоте дела Коммунистической партии, верность великим идеалам революции.

С 1924 года комсомол носит имя великого Ленина. Под воздействием ленинских идей сформировался союз революционной молодежи, выросли многие поколения борцов за коммунизм. И каждое новое поколение молодых, вступая в жизнь, вновь и вновь обращается к ленинскому теоретическому наследию, обретая верный компас в жизни и борьбе.

Речь В. И. Ленина на третьем съезде союзов молодежи стала программой комсомола на многие десятилетия вперед. «Учиться коммунизму!»—этот ленинский лозунг в разные годы наполнялся новым содержанием, отражая свершения, происходившие в стране.

Каков же смысл этого призыва в наши дни?

Мы считаем, что самое главное для комсомольца—быть активным участником коммунистического строительства, неустанно совершенствовать свое мастерство, бороться за повышение эффективности производства и качества продукции. Имечно в таких практических делах на благо Отчизны закаляется сегодня молодежь.

Я назову лишь несколько цифр, но они, на мой взгляд, весьма красноречивы. В массовом движении «Пятилетке эффективности и качества—мастерство и поиск молодых!» участвуют сегодня 1 миллион 200 тысяч юношей и девушек Белоруссии. Причем участие это вовсе не формальное. В республике создано свыше десяти тысяч комсомольско-молодежных производственных коллективов. Характерно, что производительность труда в них на 15 процентов выше, чем в обычных бригадах. А около трех тысяч комсомольских бригад уже заслужили почетное звание коллектива коммунистического труда. Более 160 тысяч молодых тружеников сдают продукцию с первого предъявления, работают с личным клеймом качества. На предприятиях и в хозяйствах внедрены тысячи рационализаторских предложений молодежи. Экономический эффект от их внедрения составил свыше 150 миллионов рублей.

Сейчас, в эпоху научно-технической революции, буквально на наших глазах происходит громадное возрастание роли молодежи в жизни общества. Посудите сами: сорок

за мяжой і дома

АДБЫЎСЯ СХОД прадстаўнікоў грамадскасці Мінска, прысвечаны Дню ААН і Тыдню раззбраення. Яго адкрыла сакратар Белсаўпрофа Л. Барабанава.

З дакладам выступіў намеснік міністра замежных спраў БССР А. Шэльдаў.

У аднадушна прынятым пісьме генеральнаму сакратару ААН К. Вальдхайму ўдзельнікі сходу выказалі поўную падтрымку новым, прасякнутым клопатамі аб умацаванні міру ініцыятывам, з якімі выступіў Савецкі Саюз на XXXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У ім таксама падкрэсліваецца, што абавязак усіх дзяржаў — членаў ААН заключаецца ў тым, каб усямерна садзейнічаць павышэнню ролі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у выкананні галоўнай задачы, абвешчанай у яе Статуце, — падтрыманні і ўмацаванні міжнароднага міру і бяспекі.

процентов от числа всех занятых в народном хозяйстве нашей республики составляют люди в возрасте до тридцати лет.

Экономика, наука требуют самых современных знаний, высокой квалификации, общей культуры человека. Легче всего такие знания, естественно, даются молодым. И так же естественно, что резко возрастают требования к молодежи, ее ответственность за выполнение намеченных партией планов. Молодежь смело выдвигается на «капитанские мостики» в промышленности, сельском хозяйстве, науке. Она активно участвует во всех государственных делах. У нас в республике, к примеру, каждый третий депутат местных Советов—моложе тридцати.

«Без преувеличения можно сказать,—говорил Леонид Брежнев,—что ни один крупный вопрос—идет ли речь о делах Советского Союза, области, района или трудового коллектива—не решается без участия молодежи. Комсомол, все юноши и девушки имеют у нас неограниченные возможности для проявления творческих сил и инициативы».

Активная жизненная позиция—одна из характернейших черт сегодняшней молодежи, комсомольцев наших дней.

Отмечая юбилей, чаще обычного обращаешься к истории. Это и понятно: история—не только память о прошлом. В ней—истоки настоящего, черты будущего... Мне бы хотелось сегодня напомнить один эпизод, произошедший ровно шестьдесят лет назад, во время работы первого съезда РКСМ, провозгласившего его создание. Съезд избрал делегацию, которая должна была посетить Ленина. Ильич—почетный председатель съезда—принял делегацию. Поэт Александр Безыменский писал, что беседа была долгой, обстоятельной и... очень неожиданной. Комсомольцы долго не могли понять, зачем Ленину знать, ходит ли молодежь в библиотеки, есть ли в клубах инструменты для самодеятельных оркестров, любят ли юноши и девушки кататься на лодках, играть в городки и шахматы? Ведь время-то было какое—гражданская война!—до того ли?!

Но Ильич прекрасно понимал, что война пройдет, молодежь поменяет винтовку на плуг и напильник, а новая жизнь, которую ей предстоит построить, будет прямо зависеть от того, насколько богат и красив внутренний мир молодых людей, насколько полна их жизнь, высоки культурные запросы.

Пожалуй, это тоже одна из характернейших черт нашей молодежи—она не расстается с книгой, тянется к знаниям, живет насыщенной, творческой, эмоционально полной жизнью. Только такой гармонично развитый человек может быть по-настоящему счастлив.

И еще один мостик в прошлое. История сохранила для нас ответы на анкету, распространенную в 1918 году среди шестнадцатилетних через Бюро психологических исследований. Вопросы простые: «что есть самое хорошее и самое дурное в жизни?», «хотите ли вы учиться?», «что бы вы изменили в порядках, существующих в мире?»

«Образованье, ученье»,—называли самым хорошим те, кто не мог этого сам написать на бумаге. «Деревня, там всего вдоволь»—вздыхали приехавшие в город. «Помогать революции». «Пообедать, быть сытым»—отвечали те, кто потуже затягивал ремни...

Самое дурное: «богатство», «золото — от него войны», «невежество»...

Они жаждали перемен. «Нужно уничтожить буржуазию и кулаков», «убрать частные лавки, попов и религию» — с юношеским максимализмом требовали они, «ввести социализм во всем мире»...

Нет, мир их не устраивал, они хотели все переиначить. Учиться, чтобы «пробить свою дорогу», «потому что учение—свет в жизни»... Но многое мешало: «голод», «недостаток обуви», «очень много работы»...

И вот спустя шестьдесят лет белорусские журналисты вновь попросили шестнадцатилетних ответить на те же вопросы.

«Самое хорошее—это сама жизнь. Жизнь мирная, полная радости, труда, любви, такая, как у нас в СССР»,—ответил Александр Макеенко из Витебска. «Самое лучшее—хорошо учиться, хорошо работать и чувствовать, что ты нужен своей Родине»,—написал полотчанин Михаил Победимский. «Самое хорошее—труд. Только в конце напряженного, пусть трудного, но удачного дня можно почувствовать себя настоящим человеком», — мнение брестчанина Александра Гвоздя.

«Самое дурное в жизни то, что ее обрывает—война». «Плохо, когда человек безразличен к тому, что происходит в мире». «Нужно запретить войны, чтобы на Земле были мир и равноправие...»

Сотни ответов, сотни мнений, во многом—разительный контраст, но в главном—удивительная общность через расстояние в шесть десятилетий: молодым нужен мир, созидательный труд, справедливая и интересная жизнь. За эти идеалы боролся и борется сегодня Ленинский Коммунистический Союз Молодежи.

Ему шестьдесят, но он по-прежнему торопит время, потому что так много нужно успеть, так много сделать самому, чтобы вновь познать радость завоеваний и гордость созидания.

Беседу записал Б. ПАСТЕРНАК.

***

У СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР знаходзіўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Савецкім Саюзе Ганс-Георг Вік.

Пасол ФРГ нанёс візіт Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Палякову. У той жа дзень ён нанёс візіт Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Кісялёву, меў таксама гутарку з намеснікам міністра замежных спраў БССР А. Шэльдавым.

Пасол ФРГ усклаў вянок да помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам на плошчы Перамогі. Затым ён зрабіў паездку па гораду, агледзеў раёны новага жыллёвага будаўніцтва.

НЕТ ПУТИ К МИРУ ЧЕРЕЗ ГОНКУ ВООРУЖЕНИЙ

Можно только догадываться, как зазвучало бы оружие ну, например, современных сверхзвуковых бомбардировщиков, реализуй человечество четырехвековой давности призыв чешского педагога Яна Амоса Коменского перелить пушки на музыкальные инструменты. А вот как это оружие может «зазвучать» в его нынешнем виде, известно достаточно точно. «Вовсе не надо 700 тысяч таких бомб, как та, что была сброшена на Хиросиму, чтобы началась ядерная война. Если такая бомба попадет в плохие руки, то для этого нужна всего одна бомба», — справедливо заметил в одном из выступлений Эдвард Кеннеди.

НЕДОЕДАЕТ КАЖДЫЙ ВТОРОЙ. УГРОЗА ГИБЕЛИ ВИСИТ НАД КАЖДЫМ

С тех пор как сенатор Кеннеди произнес эти слова, не прошло еще и трех лет. Известно, что именно на эту тысячу с небольшим дней приходится многое из достигнутого совместными усилиями государств — участников общеевропейского совещания в области политической и даже (при всей скромности результатов) военной разрядки. Но известно и другое: решающий перелом в борьбе против гонки вооружений до сих пор не произошел. Более того, в самое последнее время наиболее агрессивные силы империализма, провоцирующие усиление гонки вооружений, возврат в международных отношениях к временам «холодной войны», заметно активизировали усилия. Нет оснований утверждать, что эти силы близки к достижению своих антигуманных целей. Но есть все основания трезво оценивать вред, наносимый их деятельностью. Именно эти силы несут основную ответственность за продолжающееся перенасыщение нашей планеты оружием, призванным в конечном счете уничтожить на ней все живое. По подсчетам ООН, только накопленным уже ядерным арсеналом (а об эквивалентности его 700 тысячам бомб, сброшенных на Хиросиму и Нагасаки, давно уже никто не говорит, сейчас называют цифру 1 миллион 300 тысяч) можно до 50 раз разрушить земной шар.

Именно эти силы несут основную ответственность за то, что в мире, где голодает каждый второй, на военные нужды тратится сегодня 400 миллиардов долларов в год. Именно эти силы ведут дело как минимум к тому, чтобы оправдались прогнозы, согласно которым на рубеже XX—XXI веков вооружение будет съедать в год сумму труднопредставимую: триллион долларов. При одном условии, разумеется: если «омертвленное» сегодня оружие не успеет умертвить всех тех, из чьих карманов на протяжении десятилетий гонка вооружений вытягивала и вытягивает средства, которых так не хватает на питание и образование, медицинскую помощь и культурное развитие даже в самых развитых государствах.

Все ныне ведущиеся переговоры по контролю над вооружением и разоружению могут быть успешно завершены на протяжении сравнительно небольшого времени — считают в СССР. Но все, что уже достигнуто совместными действиями десятков государств в этом направлении, — а ни один шаг здесь не давался и не дается легко — может быть сведено на нет появлением новых видов и систем оружия массового уничтожения. Такое развитие событий означало бы практический выход гонки вооружений из-под какого бы то ни было контроля.

Складывающееся положение вызывает тревогу, разумеется, не только в Советском Союзе. «Никогда еще в истории человечества не бывало такого скопления оружия и средств массового уничтожения; никогда еще миру во всем мире не угрожал такой гигантский военный потенциал», — говорил несколько месяцев назад канцлер Шмидт. И добавил: «Никогда еще необходимость говорить друг с другом не была больше, чем сейчас».

ВЗАИМОИСКЛЮЧАЮЩИЕ ПРОЦЕССЫ

Сказанное западногерманским политиком, безусловно, верно. Не менее верными являются и два других факта. Первый: именно в наши дни появилась уникальная, по существу, возможность не только начать разговор, но и — это, безусловно, главное — договориться. И второй: возможность эта, неотделимая от того принципиально нового, что принесено в современные международные отношения разрядкой, за которую так долго боролся социализм, не по душе хозяевам конвейеров вооружений. Разрядка прокладывает реальный путь к разоружению — и именно поэтому так много сил наиболее реакционные империалистические круги тратят на то, чтобы скомпрометировать саму ее идею, не допустить реализации этой идеи в полном объеме. Конечная (в современных условиях) цель этих кругов — торпедирование разрядки, сковывающей им руки. Каким образом цель эта может быть достигнута проще всего? Нанесением новых и новых ударов по военной разрядке шагами, направленными на усиление гонки вооружений.

СССР неоднократно обращал внимание других государств, мировой общественности на то, что состояние углубления политической разрядки в условиях продолжения гонки вооружений не может продолжаться бесконечно. Понимают это и на Западе. И не только реалисты, подобные Вилли Брандту, выразившему уверенность в том, что «политическая разрядка в будущем может сохраниться только в случае, если она будет дополнена серьезными мерами в области действительной военной безопасности». Но может быть, Запад заинтересован в разрядке меньше, чем СССР? Ничуть не бывало, заинтересованность здесь абсолютно равная. Г. Моргентау, виднейший американский исследователь международных отношений, например, прямо заявляет: «Разрядка является предпосылкой выживания как Соединенных Штатов, так и России. И судьба мира по-прежнему зависит от состояния отношений между США и СССР». Ну а раз так, то есть ли оправдание безудержному росту военных бюджетов стран — членов НАТО при «замороженном» оборонном бюджете СССР? Есть ли оправдание тем 80 миллиардам долларов, которые государства Североатлантического договора намерены израсходовать на военные программы в следующем десятилетии дополнительно к десяткам и сотням «плановых» миллиардов? Есть ли оправдание попыткам замолчать или чохом отвергнуть разумные социалистические инициативы едва ли не по всем направлениям и вопросам области разоружения?

Известно, что именно советская программа действий естественным образом стала в центр дискуссий на специальной сессии Генеральной Ассамблеи ООН по разоружению. Сессии этой многие предрекали неудачу — и кое-кто немало сделал, чтобы эффект от ее работы был как можно меньше. «Я чувствую, что Белый дом меня предал... Меня удручает упущенная возможность повысить осознание всем миром — и особенно Америкой — нависшей угрозы того, что положение может выйти из-под контроля... Отказ президента США выступить на специальной сессии произвел негативное впечатление на весь мир», — эти слова калифорнийского бизнесмена Г. Уилленса, члена делегации США, позволяют понять суть происходившего в Нью-Йорке в мае—июне 1978 года. Но реализм и добрая воля, безусловно, победили в здании на Ист-ривер: убедительное свидетельство тому — итоговый документ спецсессии.

Реализм и добрая воля должны сказать свое веское и окончательное слово в борьбе за разоружение.

Юрий КАЗАКОВ,
АПН.

У мінскім Доме кнігі адкрылася юбілейная выстаўка, прысвечаная 60-годдзю ВЛКСМ. На ёй прадстаўлены сотні кніг беларускіх выдавецтваў, творы беларускіх літаратараў і пісьменнікаў з саюзных рэспублік. Адзін з раздзелаў экспазіцыі знаёміць з выдадзенымі ў Беларусі працамі У. І. Леніна. На стэндах — мастацкія творы пра моладзь, кнігі лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. НА ЗДЫМКУ: у залах выстаўкі.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

«Голас Радзімы»

№ 44 (1562), 1978 г.

Віктар КАЗЬКО

СУД У СЛАБАДЗЕ

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

[Працяг. Пачатак у № 43.]

— Я сам павінен, — адбіваўся Захар'я. — Я столькі чакаў гэтага часу, мо таму і жыву. Сваімі рукамі павінен. Цэгла, камень не возьмуць — рукамі буду, зубамі. Скочу адсюль, хрыбціну сабе зламлю, а на той свет разам з сабой аднаго ды гада прыхаплю. Колькі злосць мая выспявала, Нічыпар, як кветка тая купальская... Касу ў рукі вазьму, а ў травах — галоўкі бялявыя дзяцей маіх стаяць. Лыжку ў рукі, а з талеркі — іх вочы на мяне... Не, Нічыпар, кранам мяне адсюль здымуць. Памры, Нічыпар, маўчы да часу... А ты, Лецечка, ідзі, ідзі. Нягожа табе яшчэ глядзець, як людзі гінуць.

Лецечка адмовіўся ісці кудынебудзь без Захар'і. У ім цяпер жылі і цікаўнасць і жах: што ж тут павінна адбыцца, якіх такіх гадаў паўзучых павінны выпусціць? Як гэтых гадаў будуць наладжваць на той свет Захар'я з Нічыпарам? Жах браў ад той нянавісці, што гучала ў словах, у голасе Захар'і, якая ўзняла яго і кінула на бетонны казырок, як на кулямёт, зліла, як з'яднала, яго твар з бетонам, пакінула на ім адны толькі вочы. Лецечка адчуваў, як у ім абуджаецца нянавісць, млява варушыцца ў грудзях. Гэта была яшчэ не яго асабістая нянавісць, а толькі водгук таго, што адбывалася з Захар'ем. Ён адчуваў, што не мае права пакінуць Сучка. Ён з усёй дзетдомаўскай грамады абраў толькі яго, і ён, Колька, павінен быць побач з ім да канца.

— Добра, — сказаў Захар'я, — добра, Лецечка. Застанься, я таму і браў цябе. Прыглядвай за дарогай, як убачыш чорную такую крытую машыну, свісні і змывайся тады. Паліцэйскія былыя ў той машыне будуць.

Лецечка сеў на бетонную прыступку і пачаў углядацца ў дарогу, у жанок, якія з пустымі вёдрамі спяшаліся да калонкі, ішлі не столькі па ваду, а каб пагаманіць з іншымі жанчынамі. Спаднічнае радыё ўжо даўно пачало сваю работу, забылася і пра печы, і пра накормленых дзяцей і парсюкоў. І Кольку брала прыкрасць, што яны вось так глумяць час. Іншая справа ён. Ён — як партызан у засадзе, глядзіць і маўчыць, чорнай машыны не праваронiць. Ён і сапраўды адчуваў сябе партызанам. Вось толькі вымчыць з-за павароткі машына, ён скамандуе, і па яго камандзе... такое пачнецца...

А што тут усё ж пачнецца, паспрабаваў Лецечка ўявіць сабе: паляцяць цаглiны-гранаты, перакуліцца ўгару калёсамі машына, сканаюць у ёй гады — паліцэйскія — на радасць усім людзям, на радасць Сучку і Нічыпару. Пакрысе ён пачаў ужо разумець нянавісць Сучка і Нічыпара, спакваля мацнела і яго ўласная нянавісць: за што яны малых Сучкоў спалілі, яны ж і яго маглі таксама спаліць? Цаглінай іх, няхай ведаюць, што ім будзе за яго. Ён ужо праг, каб гэтая машына з'явілася як мага хутчэй. А голас там, на плошчы, крэп. Бушавала людское мора. Ужо не было чуваць галасоў паасобку, як спачатку, нібыта толькі ішла за хваляй хваля, варочала камене. А раніца была ціхая, задуменная, ні воблачка, ні хмаркі на небе ці хаця б залётнага, прыблуднага ветрыку. І машына ўсё не паказвалася. Колька ўжо стаміўся чакаць. Чаму б гэтым людзям, падумаў аб моры на плошчы Лецечка, не сядзець цяпер па хатах, не кляпаць пад павецямі кос — сенакос ужо на носе, бабам не палоць агародаў? Не, цягнуцца кудысьці, кінулі-рынулі ўсё. Дурны народ, зусім з глузду ўсе паз'язджалі. Паліцэйскія ім патрэбны, не маюць іншага клопату. Разбяруцца без іх. А цяпер так добра паляжаць з кніжкай у садзе, пачытаць пра тых жа немцаў, паліцэйскіх, партызан. З кніжкі больш даведаешся, чым тут убачыш. Там дзесьці ў садзе ўжо, пэўна, чакае яго Лена. А ён марна траціць час. А ў яго, калі верыць таму ж Сучку, не надта гэтага часу і ёсць. Трэба рыхтавацца. І Колька зніякавеў, таму што ён не ўяўляў сабе, як гэта туды трэба рыхтавацца. Адзенне новае трэба, дык няхай аб гэтым баліць галава ў дырэктарыхі. Напісаць лісты? А да каго іх пісаць, куды пасылаць? Развітацца з Козелам, Дзыбатым, з бабай Зосяй? Чаго загадзя з імі развітвацца, калі яны заўсёды пад рукой. Ды яшчэ развітаешся — і застанешся жыць. Тады хоць рукі на сябе накладвай. А што яму наогул рабіць, не ў сэнсе блізкай смерці, а ў сэнсе жыцця...

— Едуць, едуць! — загаласілі каля калонкі жанкі.

— Едуць, едуць! — заламантаваў Лецечка.

— Не дэмаскіруй голасам і прысутнасцю. Згінь! — піскнуў Нічыпар зверху.

Лецечка адбег ад ганка. Машына скіравала да Палаца культуры, сцішылася, развярнулася і пачала пад'язджаць да ганка. З машыны саскочылі салдаты, вылез з кабіны маёр. І салдаты і маёр, пэўна, яшчэ здалёку прыкмецілі на казырку Нічыпара і Захар'ю, і цяпер салдаты ўсміхаліся, хаваючы вочы ад маёра. А маёр задраў галаву, пільна ўглядаўся ў вочы старым, а старыя з такой жа пільнасцю, нават не міргаючы, трымаючы на выпрастаных руках, напагатове, камень і палову цаглінкі, глядзелі ў вочы маёру.

— Ну что мне с вами делать прикажете? — развёў рукамі маёр.

— Завадзіце, — піскнуў, як усё роўна аддаў загад маёру, дзед. — Нас тут нету, не відзіце вы нас.

А да ганка падвальваў ужо раз'юшаны натоўп, набягала людское мора, падхапіла, прыбіла і прыціснула да машыны Лецечку. Салдаты выстраіліся жывым калідорам ад дзвярэй машыны да дзвярэй Палаца культуры. Усутыч да іх прымкнулі і людзі. І толькі каля маёра быў свабодны, як нічыйны, астравок зямлі. Маёр па-ранейшаму з нудой, нібыта і не бачачы, не заўважаючы людзей, глядзеў на старых.

— Как мне снимать вас с этой верхотуры прикажете? Сами слезете?

— Не! — у адзін голас піскнулі дзяды. Узнялі галовы, згледзелі іх і людзі з натоўпу.

— Добрдзень, Нічыпар! Добрдзень, Захар'я!

— Ціха, ціхенька, людцы. Нас німа тут...

Выбухнуў смех, усміхнуўся і маёр.

— Помогите отцам спуститься на землю, — загадаў ён салдатам.

Але «атцы» спускацца не пажадалі.

— На руках мяне адсюль здымайце, — сказаў Нічыпар, сеў на казырок, скурчыўся і заплакаў, выціраючы вочы крысом ватоўкі. — Душы ў цябе німа, таварыш камандзір. Німа душы. Яны бацьку майго, яны дзетак маленькіх, яны ўсё наша сяло. А ты іх у машыне раскатваеш. Німа праўды, німа душы...

Маёр махнуў рукой і пайшоў у кабіну, злосна грымнуў дзверцамі. Двое салдат ужо былі на казырку. Яны ашчадна падхапілі дзеда пад пахі, Нічыпар паспеў, прыгроб да сябе камень, і салдаты, як дзіця, з рук у рукі перадалі Нічыпара разам з каменем іншым салдатам, якія стаялі ўнізе. Тыя хацелі паставіць яго на ногі, але Нічыпар не даўся, падкурчыў ногі пад сябе, і яго пасадзілі на зямлю каля ганка, як мех бульбы, маленькі чорны мех з сівой бародкай. Нічыпар трос гэтай бародкай, уздымаў над галавой камень і крычаў скрозь слёзы:

— Глядзіце, людцы, глядзіце. Вось сэрца маё! Во што з ім стала!

І зараўлі, загаласілі спачатку бабы, засмаркаліся ў хусткі і хустачкі, потым адвярнуліся, крывячы губы, і мужыкі. І тут, як па жывым, разануў натоўп дзіцячы пранізлівы плач. Плакаў Лецечка, прыпаў ілбом да кола машыны, як усё роўна самлеў на гэтым коле. Натоўп адхлынуў ад яго — такі нечаканы і такі несуцешны, надрыўны быў яго плач.

— А-а, рабёнка задавілі! — заламантавалі бабы.

— І нічога мяне не задавілі. Я зусім не таму...

Так, сапраўды ён плакаў зусім не таму, што яго крыху прыціснулі, ён і сам не ведаў, чаму ён плача: вочы не трывалі глядзець на Нічыпара, які трымаў у руках сэрца-камень. Яго, яго гэта было сэрца ў руках старога.

— Людцы, мір! — выбухнуў зверху голас Захар'і. — Не папусціцеся, не выдайце. Куля літасцівая. Агонь трэба і камень. Мучыць іх, як мучыліся мае дзеці ў агні... Дзеці мае, дзеткі, Колька Лецечка, сынок... — Захар'я на ўвесь свой магутны рост стаяў на казырку. У схватцы з салдатамі ён згубіў шапку, сівыя пасмы валасоў збіліся ў камяк, і камяк гэты варушыўся — як жывы. Захар'я быў страшны, проставалосы, сівы, замызганы, жахліва дужы, з выпрастанымі да неба акасцянелымі клюшнямі пальцаў, з амаль што звар'яцелым тварам.

— Як яны гарэлі, як яны прасілі: татачка, лёду...

Захар'я не ўстаяў, пахіснуўся, ступіў з казырка на машыну, загрукаў па блясе ботамі:

— Чуеце, гады, чуеце, смерць ваша да вас просіцца!

— Наведите порядок, быстро! — зноў сярод людзей быў маёр. Ён быў таксама сівы і проставалосы, як Захар'я. Шапку пакінуў, пэўна, у кабіне, у шафёра, пэўна ж, там застаўся і яго пісталет, таму што кабура была адшпілена і пустая.

— Чалавеча, хрыстом богам цябе заклінаю, адвярніся на мінутку, — адбіваўся ад салдат, цягнуўся да маёра Захар'я. Але маёр маўчаў, толькі тугія жаўлакі каталіся па мангольскім скуластым твары. І нечым падобныя на маёра, кволыя побач з Захар'ем, салдаты спусцілі яго на зямлю. Адчыніліся заднія дзверцы, машына крыху яшчэ здала назад, стала амаль што ўшчыльную да сцяны Палаца культуры. Забразгала жалеза ў машыне, і ў поўнай цішыні, у нейкім нават аняменні раніцы і людзей, спешна і спалохана, загрукалі ўжо там, у будынку, па дошках падлогі крокі. Ціша ўжо была неймаверная, толькі гэтыя крокі, дых людзей і мірганне іх вачэй. Маёр падышоў да кабіны, узяў з рук шафёра шапку, пісталет:

— Процесс, граждане, открытый, вход свободный, через фойе.

Ад яго кінуліся ва ўсе бакі. Імгненне-другое, і толькі салдаты, маёр, Захар'я з Нічыпарам і Лецечка засталіся каля машыны

— Отцы, я вас могу провести через служебный вход, — падышоў, дапамог устаць з зямлі Нічыпару маёр.

Захар'я з Нічыпарам змоўчалі, пабраліся за рукі і пабрылі на плошчу. Лецечка пачакаў яшчэ крыху чагосьці і пакрочыў за імі. Ён усё яшчэ не мог сцішыцца, плакаў і не ведаў сам, чаму плача.

Убіцца ўнутр Палаца культуры Кольку не пашанцавала. Народ валіў туды, пёр напралом, не зважаючы — дзе свае, дзе чужыя. У адно імгненне знеслі моцныя дубовыя ці то робленыя пад дуб дзверы. Мужчыны перлі маўкліва, напорыста, прыціснуўшы да грудзей ці да бакоў рукі, сцяўшы зубы, нібыта рабілі нейкую цяжкую і непрыемную работу. Жанчыны паспявалі і рукамі намахацца, паздымалі хусткі і хвасталі гэтымі хусткамі па твары, па вачах мужыкоў, выкрыквалі штосьці злое, нядобрае. Але ў галасе, у тлуме слоў іх ніхто не чуў і не разумеў, нібыта жанчыны гаварылі на нейкай замежнай мове. Падлеткі, як скрозь лес, прадіраліся скрозь ногі дарослых. Надрываўся, заклікаў да парадку рупар, але толькі множыў галас і тлум.

Лецечка не адважыўся і наблізіцца да гэтага вірлівага патоку. Шчыра кажучы, яму не вельмі і карцела глядзець на гэтых гадаў-паліцэйскіх — застанешся жывым па дарозе ў залу, замардуюць, дыхнуць не дадуць ужо ў самой зале, прыпрасуюць да якой-небудзь цёткі ці бабулькі, да вечара не выпусцяць на волю. І Лецечка стаяў у баку ад гэтага людскога віру, учапіўся за слуп, на якім грымеў рупар, і, крыху аглухлы ад гэтага грому, убіраў у сябе ўсё, што тут адбывалася. Яму было жудасна ад таго, што прарвалася раптам у людзях — шалёнае, злоснае. Якімі ж гадамі павінны быць паліцэйскія, калі праз столькі гадоў абудзілі такое ў людзях, ці чалавек яны, на чалавекаў так не рвуцца глядзець. Што гэта натварылі яны тут, які знак, якую рану пакінулі ў сэрцах людзей?

І яшчэ, Лецечку цяжка было паверыць, што перад ім тыя самыя людзі, якіх ён, здаецца, уведаў да апошняй кроплі. Вось па гэтых вуліцах яны з дня ў дзень хадзілі на работу, везлі на базар і ў падворкі сена на падводах і санях. Лецечка іншым разам, сцікаваўшы, як адвернецца дзядзька, пад'язджаў на іх санях ці падводах, чапляўся за рубель ці то за вяроўку, якая звісала з воза, хаваўся за сенам і ехаў сабе. Здаралася, дзядзька нязлосна сцёбаў яго пугай. Ён плакаў ад болю, выкідваў кулак: пападзешся, маўляў, і ты мне. Дзядзька лагодна пасмейваўся, выскаляў жоўтыя на сонцы зубы. А выпадала, яго і падсаджвалі на воз, частавалі вясковым духмяным салам. Салам, маслам, гуркамі і памідорамі гандлявалі яны на базарах, да хрыпаты змагаліся за капейку. З прыбыткам ці са стратай збывалі свой тавар, ашчадна завязвалі пакамечаныя рублі ў насоўкі, хавалі за пазуху бліжэй да сэрца, а пяцёрачку якую ў зубы і кіравалі да забягалаўкі, чайной — сто-дзвесце грамаў, а то і цалкам белагаловую. Хапатліва закусіўшы, іншы раз і біліся, пацяшалі людзей. А іх жонкі наглуха, да вачэй, ахутвалі чорнымі хусткамі твары, учынялі набегі на магазіны. Выходзілі з магазінаў, як на нагах устояць, абвешаныя клункамі і сеткамі з хлебам, звязкамі абаранкаў, горамі белых гарадскіх булак — гэта ў апошні час, сыты час, а раней... хапалі ўсё, што трапляла пад руку, што дзешавей, практычней,— мыла, іголкі, соль, цвікі, камбалу і кільку-хамсу, танныя кансервы, траску і чырвоную, салёную рыбу-гарбушу і на зубок дзецям — сто-дзвесце грамаў ліпкіх цукерак-падушачак. Не чуючы пад сабой ног, беглі да бальшакоў, на спадарожныя машыны, а калі іх не было, выпраўляліся без доўгіх разваг і пешшу, якая б дарога ні была — тры ці ўсе трыццаць кіламетраў, ішлі ноччу, апоўначы, больш за ўсё апоўначы, бо днём трэба было рабіць.

Дык ці гэта тыя, гаспадарлівыя, памяркоўныя, людзі цяпер на плошчы? Дзе іх тады гаспадарлівасць, дзе іх памяркоўнасць? Людское мора ў асноўным ужо схлынула з плошчы. Голас і тлум былі ўжо ўнутры будынка са шкла, каменю, мармуру. На асфальце засталіся толькі гузікі, галёшы, згубленыя бабамі хусткі ды невялічкая купка людзей. Прасторны, з запасам, з перспектывай пабудаваны Палац культуры не змог увабраць усіх, не змог увабраць, умясціць у сябе нечакана абуджанае гарадское і вясковае гора, нянавісць. Людзі гронкамі віселі на адарваных, перакошаных дзвярах, купкамі стаялі каля ганка і каля раптоўна знямелага рэпрадуктара. То маўкліва ўздымалі галовы ўгару, то глядзелі на Кольку, які прыціснуўся да слупа і адчуваў сябе як голым усё роўна, распятым іх маўчаннем, нібыта якаясьці частка віны за тое колішняе, мінулае, але не забытае ляжала і на ім. Паглядаў на людзей, як ваўчанё, спадылба. Мітуслівы, галасны ранак ужо накладваў свой адбітак на яго твар, пад вачыма выступалі ўжо зямлістаўгальныя цені, вочы як выпхнуў хто — так пастаўлены былі яны ўсім на пагляд, пукатыя, ненатуральна белыя бялкі, парэзаныя чырвонымі, трывожнымі ніцямі прожылкаў, якія амаль што дасягалі зрэнкаў. У зрэнках выспявалі здзіўленне, разгубленасць і боль. Боль, трывога і крык спелі і на ружовых скулах яго, на тоненькай, пудлівай маршчынцы каля падбародка. Боль, загнанасць былі і ў яго сутаргавым дыханні. Ён і згадаць не мог, колькі цяпер у ім, дзетдомаўскім, казённым, дакору, але людзі адчувалі гэта. І ніхто не затрымліваў на ім вачэй, і ў той жа час ніхто не мог адвесці ад яго вочы, нібыта не рэпрадуктар, а ён, Колька Лецечка, павінен быў сказаць ім мо тое адзінае, прыхаванае слова, якое б вытлумачыла ўсё: навошта, дзеля чаго яны, шматпакутныя, прыйшлі сюды.

Лецечка ўжо вырашыў збегчы ад іх вачэй, яго ўжо не трымалі ногі, і ён ужо адарваўся ад слупа, а на тую хвіліну ў рэпрадуктары штосьці гучна шчоўкнула. Кольку памсцілася, што гэта шчоўкнула штосьці ў ім — так разанула застыглае, спруцянелае цела пранізлівым узрушаным голасам.

— Встать! Суд идет!..

«Суу-ууд ёт-ёт-ёт» — пакацілася над плошчай, гонтавымі і саламянымі стрэхамі хат, загуло ў лісцях дрэў, над аціхлай Слабадой. Лецечка і ўсе, хто быў побач з ім, распраміліся, выпрасталі спіны, шоркнулі па зямлі ботамі і чаравікамі. І доўгая, гаротная цішыня каменем лягла на зямлю. Толькі там, за шклом і бетонам, у Палацы культуры,— выразныя і ўсё мацнейшыя, як удары метранома, што адлічвае час, але не секунды, а гады, крокі. Абвальны грукат адсунутых крэслаў і ўздых. Уздых там, у зале, і тут, на плошчы. Уздых хваляй прамчаў па плошчы, па горадзе і знік — поле і лес паглынулі яго. Пад нагамі ў Лецечкі толькі здрыганулася зямля, зямля, здалося яму, таксама ўздыхнула. Лецечка адштурхнуўся ад слупа і пайшоў па дрыготкім, растопленым асфальце, але кіраваў ён не ў дзетдом, а ў поле, дзе палавела ўжо жыта. Неба, мсцілася яму, наблізілася да зямлі. І было яно ўжо зусім не небам, а блакітным празрыстым шарам. І ён ішоў пад гэтым ашчадным да яго шарам, кратаў яго рукамі. Шар быў цёплы, родны. І скрозь добра відаць было ўсё: і жыта, і далёкія, пакрытыя саломай і чаротам хаткі і хлявы вёскі, што была пад горадам, і конь, і жарабё, што стаялі на ўзгорку, і бабулька, што рвала сурэпку на картаплянішчы, і буслінае кубло на вільчыку старой хаты, і сам бусел, які выстойваў на адной назе, як вартаваў усё, што бачыў Лецечка, вартаваў сам час, бела-ружовы ў ружовым ранку бусел.

[Працяг будзе.]

ПРЭМІЯ ВЯНЧАЕ ДАСТОЙНЫХ

Напярэдадні 60-годдзя Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі сталі вядомы чарговыя лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Гэта прэмія прысуджаецца раз у два гады маладым літаратарам і дзеячам мастацтва, журналістам, вучоным, інжынерам, рабочым і калгаснікам.

Сярод лепшых у галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі названы паэтэса Яўгенія Янішчыц, пісьменнік Алесь Жук, брэсцкі народны ансамбль танца «Радасць», ансамбль песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, рэжысёр Валерый Мазынскі і акцёр Сяргей Шульга з віцебскага тэатра, кампазітар Валерый Іваноў, кінарэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, творчы калектыў на чале з кінарэжысёрам Валерыем Рубінчыкам, радыёжурналісты Васіль Слушнік, Ніна Чайка, Іван Садоўскі.

Пастаянныя чытачы «Голасу Радзімы» згадаюць, што многія з пералічаных вышэй прозвішчаў яны ўжо сустракалі на старонках газеты. Так, расказваючы пра набыткі сваёй культуры, мы ніколі не мінаем маладых творцаў. Таму і сёння з радасцю прадстаўляем трох лаўрэатаў.

«РАБІЎ, ШТО МНЕ ПАДАБАЛАСЯ...»

Інтэрв'ю з кампазітарам Валерыем ІВАНОВЫМ

— Валерый, вам прысудзілі прэмію за стварэнне вакальна-сімфанічнай паэмы на словы М. Танка «Элегія аб чацвёртай бярозе» і песень пра камсамол. Калі ласка, некалькі слоў пра гэтыя творы.

— «Элегія» — буйны вакальна-сімфанічны твор, у якім сродкамі музыкі я імкнуўся перадаць журбу і мужнасць, горыч страт і перакананасць. Гаворка пачынаецца з Хатыні. Гэта там палае Вечны агонь на месцы чацвёртай бярозы — сімвала кожнага чацвёртага загінуўшага жыхара Беларусі. Але тэма развіваецца шырэй. Яна пераходзіць у нашы дні, калі наўкола цвіце і красуе жыццё, і людзі з глыбокай пашанай і жалем у сэрцы схіляюць галовы перад памяццю тых, каму мы бясконца ўдзячны за мірнае неба. Акрамя аркестра, у паэме гучаць хор, галасы чытальніка і спевака.

Твор запісаны на радыё, будзе выконвацца ў Белдзяржфілармоніі.

А песні мае расказваюць пра мары, імкненні, парыванні сучасных юнакоў і дзяўчат.

— Скажыце, як пачалася ваша кампазітарская дзейнасць? Дзе вытокі творчасці, калі гэта можна вызначыць?..

— Назаву дакладна — вытокі ў вёсцы Растаў на Гомельшчыне. Я нарадзіўся ў Глуску, але кожнае лета бацькі адвозілі мяне да бабулі ў вёску. Шчодрыя там на песні людзі! Спяваюць на вяселлях, на святах. Мелодыі мелі нада мной такую ўладу, што я мог дзень і ноч стаяць пад вокнамі хаты, дзе ішло вяселле. Вабілі галасы спевакоў, кранала душу ігра на жалейцы ці гармоніку. І дагэтуль водгулле тых песень жыве ўва мне.

Гадоў, мусіць, у сем, я ўпрасіў бацьку купіць гармонік і хутка навучыўся іграць. Калі я прыязджаў у вёску, мяне слухалі. А кемлівы дзядзька вадзіў мяне на вечарынкі, каб я іграў для дзяўчат. Часта яны спявалі, і мне гэта падабалася.

Згадваючы дзіцячыя гады, я часам здзіўляюся, як паслядоўна ішоў я да кампазітарскай дзейнасці, хаця ні намераў, ні мар падобных ніколі не меў. Проста я ўвесь час рабіў тое, што мне падабалася. Не прапускаў ні аднаго свята з песнямі. Ведаў і іграў шмат песень і танцаў. Аднойчы, паспрачаўшыся з сябрам, я іграў без перапынку дзве з паловай гадзіны і выканаў 100 песень, не паўтарыўшыся ні разу. Калі ў Глуску адкрылася дзіцячая музычная школа, я стаў вучыцца па класу баяна. У школьныя гады напісаў свае першыя песні, інструментальныя п'есы. Потым вучыўся ў Гродзенскім музычным вучылішчы. І аднойчы там наладзілі нават мой аўтарскі вечар. Магнітафонны запіс усяго выкананага на ім захоўваю як каштоўную рэліквію.

Скончыў кансерваторыю. Маім настаўнікам быў вядомы беларускі кампазітар Пётр Падкавыраў. Працаваў некаторы час у Маладзечанскім музычным вучылішчы. Цяпер выкладаю інструментоўку ў кансерваторыі. І пастаянна пішу.

— У якіх жанрах вы працуеце?

— Дыяпазон — ад песні да сімфоніі. Перавагу аддаю сур'ёзнай музыцы. Але і без песень не магу. Напісаў музыку да кінафільма. Прыкладна з 1970 года мае творы сталі ўключаць у канцэрты прафесійныя выканаўцы.

— Валерый, адкуль бяруцца тэмы вашых твораў?

— Яны прыходзяць самі. Усё атрымліваецца неяк проста і само па сабе. Мяне цікавіць духоўны свет равеснікаў, я імкнуся спасцігнуць яго і пераказаць у песні — слухачам падабаецца. Мяне трывожыць рэха мінулай вайны — я пішу пра гэта. Можа, каму такое здасца дзіўным, бо я не ваяваў, не зведаў ваенных пакут. Усё гэта выпала на долю бацькоў. Яны рэдка ўспаміналі — балюча, але эмацыянальна я ўспрыняў іх боль. У Беларусі інакш проста нельга. Тут зямля і людзі прасякнуты памяццю, пакутамі і мужнасцю.

Часта езджу з бацькам на сустрэчы ветэранаў у Чэхаславакію — ён удзельнік славацкага паўстання. І маё разуменне вайны становіцца больш глыбокім, як і больш шырокай тэма патрыятызму. Дарэчы, пасля адной такой паездкі, перапоўнены ўражаннямі, я прачытаў «Элегію аб чацвёртай бярозе» М. Танка. І не мог не выказаць свае думкі ў музыцы.

— Пра што вы марыце?

— Аб'ехаць увесь свет. Падарожнічаць я ўвогуле люблю. Кожнае лета з сябрамі мы вандруем па рэках Беларусі. Давялося быць у розных мясцінах Савецкага Саюза. Ездзіў з бацькам у Чэхаславакію, наведаў Венгрыю. Але яшчэ са школьных урокаў геаграфіі жыве ўва мне жаданне ўбачыць Аўстралію.

— Я чакала, што вы скажаце пра новыя творы...

— Яны загучаць самі, калі прыйдзе час. А я толькі запішу іх на паперу.

Гутарку вяла
В. ТРЫГУБОВІЧ.

«Нам важна было паказаць, што ў аснове гераічнага характару ляжыць не фанатызм ці бесшабашнасць, а арганічнае пачуццё грамадзянскага абавязку...» Так сказаў рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў пра свой фільм «Зімародак», дзе ў цэнтры ўвагі стаіць Настаўнік і яго вучні. Але гэта справядліва і ў дачыненні да наступнай работы пастаноўшчыка на «Беларусьфільме» — стужкі «Хлеб пахне порахам», якая ўзнаўляе невялічкі эпізод Вялікага Кастрычніка — адпраўку вагонаў з хлебам для рускіх ваеннапалонных у Германіі. Выдатны вобраз камісара-бальшавіка, гістарычна праўдзівыя кадры бурлівых палітычных падзей у Оршы летам васемнаццатага года прыцягваюць увагу гледачоў самых розных узростаў. Фільм «Сын старшыні» лагічна працягвае даследаванне характару савецкага чалавека. Ён закранае праблемы сучаснага сяла, вымушае рэжысёра больш глыбока ўнікаць у жыццё.

Актыўная грамадзянская пазіцыя і мастацкія набыткі прынеслі маладому рэжысёру-пастаноўшчыку прызы і ўзнагароды на кінафестывалях. Цяпер яго прызнанне стала больш шырокім — Вячаслаў Нікіфараў названы лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

НА ЗДЫМКАХ: кадры з фільмаў «Зімародак» і «Хлеб пахне порахам».

З КНІГІ ВЕРШАЎ «ДЗЕНЬ ВЕЧАРОВЫ»

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

Яшчэ мяне зусім няма
Ні ў шуме траў,
ні ў лісцях юных,
Ды ўжо іскрысты снег зіма
Заткала мне на падарунак.

Яшчэ няма мяне.
Але
Чаканне ёсць і ёсць трывога.
Ёсць хлеб, і песня на сяле,
І ў свет шырокая дарога.

Яшчэ няма мяне.
Аднак
У залатым рознагалоссі,
Нібы узрушаны мастак,
Мой першы след
малюе восень.

БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

Радзімы вецер!
Ён з усіх вятроў
Мне як натхненне,
Як шчаслівы подых.
Ёсць доўгі шлях,
Дзе мы,
Як параходы,
Вяртаемся
Да родных берагоў.

Удалечыні
Прыйшлося столькі жыць
І слаць сябрам
Паклоны у канверце...
Ёсць міг такі,
Калі не страх памерці,
А страх —
Цябе сабой не засланіць.

ДРУГУ

Прымі святло,
Што льецца з-пад пяра
І вырастае ў сонца
пад рукамі...
У нас цяпер —
Асенняя пара
І лес наскрозь прапах
Баравікамі.

І я начамі доўгімі не сплю,
Як чалавек,
Навек адданы саду.
А ўсё таму,
Што родам з лістападу —
Я восень задуменную люблю.

То з выраем
Кружляю ў паднябессі,
То, нібы ліст,
Злятаю на траву.
І думаю:
Як-небудзь дажыву
Да слоў тваіх,
Як да гукальнай песні.

* * *

Калі не мне вясну пачуць,
Калі не мне ісці па травах,—
Сябры мае, што злева,
справа,
Замоўкнуць песні не дадуць.

У горы з сонцам напалам
І ў трудных пошуках, у быце,
Калі не мне — маім сябрам
Глыбей у сэрца зазірніце!

хроніка культурнага жыцця

У РЭСПУБЛІКАНСКІ Палац культуры прафтэхадукацыі БССР прыйшла тэлеграма са Свярдлоўска аб тым, што ансамбль «Чырвоныя зоркі» на ўсесаюзным конкурсе стаў лаўрэатам і заваяваў галоўны прыз.

ПРЭМ'ЕРАЙ спектакля па п'есе М. Горкага «Апошнія» пачаў сваё выступленне ў Мінску народны драматычны калектыў Дома культуры чыгуначнікаў Віцебска.

На гастролі самадзейныя артысты прывезлі таксама спектаклі «Прымакі» па п'есе Я. Купалы і «Маладыя» драматурга Т. Ян.

ПЯЦІКЛАСНІК з Полацка баяніст Вася Тачыла атрымаў першы прыз на трэцім рэспубліканскім конкурсе навучэнцаў музычных школ.

КНІЖНАЯ выстаўка «Будоўля маладосці — БАМ», на якой прадстаўлена дакументальная літаратура і фотаздымкі, адкрылася ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце.

ПАЧАЛІ працаваць новыя дзіцячыя самадзейныя калектывы — гурток мастацкага слова, хор школьнікаў, студыя бальнага танца і харавая — у Палацы культуры Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно».

У ВІЦЕБСКУ адкрылася выстаўка работ члена Саюза мастакоў БССР Пятра Явіча, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння і 40-годдзю яго творчай дзейнасці.

ПРАЦАЎНІКІ сайгаса «10 гадоў БССР», што на Любаншчыне, азнаёміліся з выстаўкай «Янка Купала і Кастрычнік», арганізаванай Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

ГОМЕЛЬСКІ абласны тэатр паказаў гледачам новую работу — спектакль-казку «Чалавек з хвастом».

«БЕЗ СПРАВЫ НЕ МАГУ...»



Шматлікія паліцы ўздоўж сцен і пад столлю застаўлены яшчэ сырым посудам: гаршкамі, глякамі, міскамі, збанкамі, спарышамі. Пакуль яны нічым асаблівым не вызначаюцца, такія ж шэрыя, як і любыя яшчэ не абпаленыя вырабы з гліны. Звяртае ўвагу хіба толькі дэкор — светлыя палоскі на шурпатай паверхні, нанесеныя цвёрдым гладкім прадметам (лашчылам) на прасохлы посуд. Такі дэкор — касая сетка, ёлачка, хвалістыя паяскі — вядомы яшчэ з часоў жалезнага веку. Гэткая ж старажытная і тэхналогія вырабу. Посуд абпальваюць у закрытай печы смалістымі дровамі, ад чаго ён становіцца матава-чорны, нібы адліты з чыгуну, а палоскі ўзору набываюць металічны бляск.

Калі ўлічыць, што кераміка ўвогуле больш, чым іншыя віды народнага мастацтва, захавала старажытныя традыцыі, то пра чорнаглянцаваную і гаварыць няма чаго. Яна — нібы своеасаблівы рэлікт у беларускім народным мастацтве, які ледзь было беззваротна не знік. Але рост цікавасці да народнага мастацтва, характэрны цяпер, бадай, для ўсяго свету, вельмі своечасова ажывіў гэты старажытны промысел, хаця, вядома, не ў такой колькасці, як раней, калі кераміка ў народным побыце была самым тайным і «дэмакратычным» посудам.

Калісьці чорнаглянцаваны посуд рабілі ў многіх ганчарных цэнтрах Заходняй Беларусі: Пагосце-Загародскім пад Пінскам, Поразаве ля Ваўкавыска, на Навагрудчыне. Але лепшай па праву лічылася пружанская кераміка. Свае вырабы пружанскія майстры развозілі далёка па наваколлі, траплялі аж на Валынь, і ніколі не вярталіся назад з непрададзеным таварам.

Сёння кожны ў Пружанах пакажа сядзібу, дзе жыве патомны ганчар, адзін з захавальнікаў і прадаўжальнікаў традыцый старажытнага рамяства Антон Такарэўскі. Яго ганчарскі «стаж» складае больш як паўстагоддзя, а калі лічыць бацьку, дзеда і больш далёкіх продкаў, то пачатак ганчарскай дынастыі хаваецца ў глыбіні стагоддзяў. Па ўзросту (пераваліла за семдзесят) Антон Рыгоравіч даўно мог кінуць занятак, але любоў да справы не дазваляе яму сядзець, склаўшы рукі. За ганчарным кругам я і застаў яго на прасторнай кухні, што адначасова была і рабочым месцам.

— Без справы я не магу, — гаворыць майстар, спрытна ўпраўляючыся з камяком гліны, які ў чуйных пальцах хутка прымае акрэсленыя формы. — І век немалы, і здароўе не тое, даўно пара было б кінуць гэты даволі шкодны занятак, што я і спрабаваў ужо не раз зрабіць. Але ці надоўга цярпення хапала? Затое, што казаць, і рамяство ведаю як мае быць. Завяжы мне вочы, дай у рукі камяк гліны, і я вызначу, на што яна прыдатная. Неяк прыязджала да мяне з Ленінграда жанчына адна, скульптар. Нечага ёй трэба было навучыцца і ганчарству, дык яна думала асвоіць гэтую справу за які тыдзень. Вучыся, кажу, а я адначасова паспрабую скульптурай заняцца, даўно пра гэта мару... Прабыла яна ў мяне тыдні два. Не скажу, посуд рабіць добра налаўчылася, але потым усё ж махнула рукой і пажартавала: «Не, Антон Рыгоравіч, вашага ўзроўню мне не дасягнуць, відаць. Вы такі ж майстар сваёй справы, як і я — сваёй». А я, і праўда, скульптарам так і не стаў, атрымліваецца нешта, ды не тое... Відаць, гаршкі ды збанкі і ёсць маё прызванне. І людзям жа маё рамяство патрэбна, а то ці стаў бы я рабіць? То на выстаўкі просяць, то так прыязджаюць купіць. Аж з Прыбалтыкі госці бываюць, вельмі ж ім да спадобы наш чорны посуд. «О-о, Пружаны! Добрыя гаршкі на мяса!» Мяса, бачыце, у маіх гаршках добра гатуецца... Яно і праўда: гліна тут добрая, гаршкі служаць доўга. Такі ж посуд робяць некалькі ганчароў і ў суседнім Поразаве, але там гліна горшая, чарапок таўсцейшы атрымліваецца, а трываласць усё адно не тая. Так што, хочаш не хочаш, а з глінай, пакуль магу, разлучацца мне не выпадае.

— А я б яе і бачыць не хацела, — умешваецца гаспадыня. — Вечны бруд, кожны дзень парадак наводзь, каб чужога чалавека не саромецца. Ды і пра здароўе пара падумаць.

Гаспадар толькі хітра ўсміхнуўся. Такую яго рэакцыю я зразумеў, выйшаўшы на двор. Аблажыўшыся ўжо падсохлым посудам, гаспадыня ... спрытна наводзіла гладкім крамянёвым каменьчыкам узоры.

— Што пабурчыць трохі, то гэта толькі для прыліку, — смяецца гаспадар. — А так яна ў мяне першая памочніца.

— А дзе ж дзенешся? Як кажуць, з кім павядзешся... Толькі крыўдна трохі, — паўжартам, паўсур'ёзна дадае «першая памочніца». — Усё Такарэўскі ды Такарэўскі... А Такарэўская дзе? То хоць вы ўжо не дапусціце такой несправядлівасці.

Я і сфатаграфаваў іх разам, занятых такой старажытнай і патрэбнай людзям справай. А пра тое, што цікавасць грамадскасці да мастацтва «гліны і агню» няўхільна расце, сведчаць дыпломы і граматы з выставак, якіх нямала ў Антона Рыгоравіча. Яго творчасць ведаюць не толькі ў Мінску, Маскве, Вільнюсе і іншых гарадах нашай краіны, але і ў ЗША, Канадзе, Японіі. І ўсюды яго чорны посуд выклікаў захапленне, а ў кнігах водгукаў з'яўляліся шчырыя словы ўдзячнасці майстру за тое, што ён захоўвае і прадаўжае традыцыі старажытнага рамяства.

Яўген САХУТА.
Фота аўтара.

СЯДЗІБА Ў СКОКАХ

На Беларусі ёсць шмат мясцін, звязаных з імёнамі вядомых вучоных, асветнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў. Трапляючы туды, дзе яны жылі і працавалі, мы згадваем іх неўміручыя творы, іх уклад у развіццё навукі і культуры, лепш уяўляем час і абставіны, якія ўплывалі на іх лёс. Менавіта таму мы шануем гэтыя месцы.

Адным з гістарычных помнікаў з'яўляецца сядзіба ў Скоках каля Брэста. Тут 16 лютага 1758 года нарадзіўся вядомы пісьменнік Юліян Нямцэвіч, аўтар паэтычных і празаічных твораў: «Вяртанне пасла», «Элегіі, напісаныя ў рускай турме», «Два паны Сяцекі», «Ян з Тэнчына», «Гістарычныя песні» і інш. Прадстаўнік класіцыстычнага кірунку ў літаратуры другой паловы XVIII—першай паловы XIX стагоддзя, Нямцэвіч у сваёй творчай і грамадска-палітычнай дзейнасці з'яўляўся выразнікам ідэй дэмакратычнай інтэлігенцыі.

Цікавы лёс гэтага чалавека, які не толькі сваімі творамі, але і са зброяй у руках змагаўся супраць засілля царскага самадзяржаўя, за свабоду Айчыны. Так, ён быў ад'ютантам Тадэвуша Касцюшкі ў час паўстання 1794 года і, паранены, трапіў у палон. Потым — двухгадовае зняволенне ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля вызвалення з турмы нейкі час быў у ЗША. Вярнуўшыся на радзіму ў пачатку XIX стагоддзя, Нямцэвіч заняўся навуковай дзейнасцю — быў старшынёй Варшаўскага таварыства сяброў навук. Ён шмат падарожнічаў па Польшчы, Літве і Беларусі, надрукаваў некалькі краязнаўчых твораў («Дзённікі маіх часоў», «Гістарычныя падарожжы па польскіх землях» і інш). У 1831 годзе Ю. Нямцэвіч прымае ўдзел у паўстанні, пасля паражэння якога ён быў вымушаны эмігрыраваць у Францыю. Памёр у Парыжы ў 1841 годзе.

Сядзібны ансамбль у Скоках размяшчаецца ў маляўнічай мясцовасці сярод старога парку, які зарос вялікімі магутнымі дрэвамі. Галоўны будынак сядзібы — двухпавярховы дом, збудаваны ў XVIII стагоддзі. Ён сінтэзаваў у сваёй архітэктуры два стылі: барока і класіцызм. З архітэктурай барока звязаны анфіладны план будынка, дзе на першым паверсе была вялікая парадная зала, якую акружалі пярэднія пакоі, гасціныя, кабінеты і г. д., нарэшце — ламаны двух'ярусны дах над усёй пабудовай. Класіцызм унёс свае карэктывы ў архітэктуру будынка. Яго фасад зрабіўся плоскім, вертыкальныя і гарызантальныя элементы чляненння (пілястры, лапаткі, паясы карнізаў) амаль што не выходзяць па-за плоскасць сцен. Цэнтральную частку дома вылучае балкон на двух масіўных слупах, якія ў першым ярусе ўтвараюць своеасаблівы партал уваходу. Раней з двух бакоў жылога будынка стаялі бакавыя флігелі, якія разам утваралі паўзамкнёную кампазіцыю параднага двара—курданера. У склад ансамбля ўваходзілі гаспадарчыя пабудовы і капліца.

Ансамбль у Скоках — цікавы гісторыка-архітэктурны помнік, у якім адлюстраваліся галоўныя працэсы, што адбываліся ў беларускім дойлідстве сярэдзіны і другой паловы XVIII стагоддзя ў сувязі са станаўленнем новага стылю — класіцызму.

Ю. ЯКІМОВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: сядзіба ў Скоках.
Фота аўтара.

Спорт

У Ленінакане (Армянская ССР) завяршылася першынство Добраахвотнага спартыўнага таварыства прафсаюзаў па барацьбе дзю-до сярод моладзі, у якім прынялі ўдзел 130 спартсменаў з 20 прафсаюзных таварыстваў краіны. У паўсярэдняй вазе прызавыя месцы занялі мінчане В. Бухвал і А. Шчэрба.

***

На рэдкасць выніковым быў дзевяты тур фінальнага турніра чэмпіяната свету па міжнародных шашках у Арко (Італія). Усе лідэры прайшлі на ачко наперад. Вельмі важную перамогу атрымаў мінчанін Анатоль Гантварг над галандцам Дростам.

***

На розыгрышы Кубка СССР па акадэмічнай грэблі ў Кіеве ад нашай рэспублікі выступіла каманда ў складзе 23 спартсменаў. Найбольшага поспеху дабілася маладая спартсменка, студэнтка з Гомеля Надзея Філіпава.

***

Французскі горад Страсбург прыняў удзельнікаў XIX чэмпіяната свету па спартыўнай гімнастыцы. Жаночая каманда напалавіну прадстаўлена спартсменкамі з Беларусі. Гэта — Нэлі Кім (Мінск), Таццяна Аржаннікава (Віцебск) і Валерыя Жыдунова (Магілёў).

***

На прайшоўшым у Севастопалі чэмпіянаце СССР па паруснаму спорту лепшага выніку сярод беларускіх спартсменаў дабіўся 21-гадовы Алег Сполан.

***

У сталіцы Кіргізіі завяршылі спрэчку ўдзельнікі чэмпіяната краіны па стэндавай стральбе. На траншэйным стэндзе перамогу атрымаў Г. Галкін з Мінска.

ПАПУЛЯРНЫЯ ІМЁНЫ

Дзяржаўныя служачыя многіх кантонаў Швейцарыі правялі цікавае даследаванне. Іх цікавіла, якія імёны карыстаюцца найбольшай папулярнасцю ў маладых бацькоў. Высветлілася, што на першым месцы — рускія. У Берне гэта перш за ўсё Саша і Міша, у Цюрыху — Таццяна, у Жэневе — Вольга і г. д. Некалькі год назад амаль кожнае чацвёртае дзіця ў краіне было Пятром або Марыяй.

Гумар

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1577